ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Год выдання 34-ы
№ 88 (2037)
2 лістапада 1965 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ЗАЛАТАЯ ЗОРКА НА СЦЯГУ БРЭСЦКАЙ КРЭПАСЦІ

На карце свету, як вядома, Брэстаў два. Адзін у Францыі, другі ў нашай краіне. Каб французскі і наш не блыталі, некалі даўно горад, што над Бугам і Мухаўцом, называлі Брэст-Літоўскам. Сёння нейкую часцінку да сваёй старадаўняй назвы не зашкодзіла б прыдумаць порту на Атлантычным узбярэжжы. Занадта вялікая сёння слава ў Брэста савецкага. Слава, для якой не існуе мяжы. Слава, якая выклікае ў мільёнах сэрцаў захапленне і гонар за мужнасць, непахіснасць, патрыятызм, на якія здольны савецкі чалавек.

Пра гераічную абарону Брэсцкай крэпасці складзены песні, напісаны кнігі, пастаўлены кінафільмы. З часоў вайны пра асілкаў цытадэлі над Бугам у народзе нараджаюцца ўсё новыя легенды і паданні. Але вось выдатны следапыт подзвігу пісьменнік Сяргей Сяргеевіч Смірноў назваў нам імёны ўдзельнікаў Брэсцкай эпапеі, што, прайшоўшы праз агонь, барацьбу і пакуты, засталіся жывыя, і мы ўбачылі на фотаздымках, у кінахроніцы, па тэлебачанні зусім не казачных віцязяў — убачылі мужчын і жанчын, нічым знешне не адметных ад нашых суседзяў, таварышаў па рабоце, сустрэчных прахожых. Значыць, справа не ў нейкім адборным складзе гарнізона, што раніцай 22 чэрвеня 1941 года пачаў сярод муроў Брэсцкай крэпасці няроўны гераічны бой з незлічонай зграяй гітлераўцаў, бой, якому суджана было не сціхаць яшчэ доўгія тыдні і месяцы, хоць лінія фронту даўно адышла на ўсход, — не, бітву ля Брэсцкай крэпасці, бітву, бяспрыкладную ў гісторыі войнаў, бітву, якая на стагоддзі застанецца ўзорам стойкасці і самаадданасці, вялі звычайныя чырвонаармейцы, камандзіры, члены іх сем'яў, і ў гэтым тым большае яе значэнне. Бо гэта значыць, што гераізм абаронцаў Брэста — часцінка гераізму ўсяго савецкага народа, крыніца іх мужнасці — крыніца, што натхняла і натхняе ўвесь наш народ, агонь, што палаў у іх сэрцах, — часцінка агню, назва якому — любоў народа да Савецкай Айчыны, назва якому — адданасць народа ідэалам партыі.

Брэст — заходнія вароты Савецкай краіны. Вароты дружбы, вароты добразычлівасці і вароты, якія сурова папярэджваюць тых, хто прыходзіць да нас з нядобрымі намерамі. Сімвалам нязломнасці, сімвалам таго, што няма для савецкага чалавека нічога даражэй за свабоду і шчасце Радзімы і што ў барацьбе за гэтую свабоду і шчасце ён непераможны, стаіць і вечна будзе стаяць гераічная крэпасць над Бугам.

У знак неўміручай заслугі крэпасці перад нашым народам, перад свабодалюбівым чалавецтвам Савецкі ўрад прысвоіў ёй ганаровае званне «Крэпасць-герой».

... Урачыста, па-святочнаму выглядае ў гэтыя дні Брэст. Горад упрыгожан чырванню сцягаў, транспарантаў, пано, якія ўслаўляюць подзвіг савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. На Цэнтральнай плошчы галерэя партрэтаў Герояў Савецкага Саюза — удзельнікаў гераічнай абароны крэпасці і вызвалення горада ад фашысцкіх захопнікаў, Герояў Сацыялістычнай Працы.

Да сівых муроў крэпасці прыходзяць тысячы і тысячы людзей. Яны аддаюць даніну павагі тым, хто стаяў тут насмерць, хто не загінуў — увайшоў у бессмяротнасць. Горы вянкоў і букетаў жывых кветак вырастаюць ля помніка невядомаму салдату, на брацкіх магілах воінаў.

Учора ў памяшканні Абласнога драматычнага тэатра імя Ленінскага камсамола Беларусі адбылося ўрачыстае ўручэнне крэпасці-герою ордэна Леніна і медаля Залатая Зорка. Падзяліць з працоўнымі горада гэтую радасную падзею прыехалі член Прэзідыума ЦК КПСС, першы намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР К. Т. Мазураў, кіраўнікі партыі і ўрада Беларусі, удзельнікі гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці, дэлегацыі гарадоў-герояў.

— У гэтым годзе савецкі народ урачыста адзначыў 20-годдзе гістарычнай перамогі над фашысцкай Германіяй, — сказаў у сваёй прамове на ўрачыстым пасяджэнні Брэсцкага гарадскога камітэта КП Беларусі і гарадскога савета дэпутатаў працоўных сумесна з прадстаўнікамі грамадскіх арганізацый і Савецкай Арміі тав. К. Т. Мазураў. — Слаўнай старонкай у гераічны летапіс Вялікай Айчыннай вайны ўвайшла абарона Брэсцкай крэпасці, якая прадэманстравала перад усім светам прыклад выключнай стойкасці і вытрымкі, бязмежнай адданасці нашых людзей Савецкай Айчыне. Брэсцкая крэпасць стала ўвасабленнем мужнасці і неўміручай славы савецкага народа, сімвалам вернасці нашых салдат воінскай прысязе.

Мужнасць байцоў і камандзіраў Брэсцкай крэпасці жывілася вялікімі ідэямі сацыялістычнага патрыятызму. Вернасць партыі Леніна, сваёй сацыялістычнай Радзіме абаронцы крэпасці пранеслі як святыню праз самыя цяжкія выпрабаванні. Душой абароны крэпасці, яе баявым ядром былі камуністы. На працягу ўсяго перыяду баявых дзеянняў яны знаходзіліся ў першых радах воінаў, на самых важных рубяжах.

К. Т. Мазураў зачытвае Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. Надыходзіць урачыстая мінута. На сцэну ўзнімаецца дэлегацыя на чале з першым сакратаром Брэсцкага гаркома КП Беларусі В. С. Грынько. Пад гром авацый усіх прысутных К. Т. Мазураў прымацоўвае ордэн Леніна і медаль «Залатая Зорка» да сцяга Брэсцкай крэпасці-героя і перадае на вечнае захаванне Грамату Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. Уся зала стоячы апладзіруе мужным абаронцам легендарнай цытадэлі, вялікаму савецкаму народу і роднай Камуністычнай партыі. Усе члены дэлегацыі, апусціўшыся на калена, цалуюць свяшчэнную рэліквію-сцяг крэпасці-героя. Юныя піянеры падносяць букеты жывых кветак членам прэзідыума ўрачыстага пасяджэння.

Удзельнікі гераічнай абароны, прадстаўнікі працоўных Брэста, воінскіх часцей, якія вызвалялі горад, выказалі глыбокую ўдзячнасць Камуністычнай партыі і Савецкаму ўраду за высокую ацэнку ратнага подзвігу гарнізона Брэсцкай цытадэлі.

З прывітаннямі ад працоўных гарадоў-герояў выступілі кіраўнікі дэлегацый Масквы, Ленінграда, Кіева, Валгограда, Севастопаля і Адэсы.

Затым з прамоваю выступіў першы сакратар ЦК КП Беларусі П. М. Машэраў.

Удзельнікі пасяджэння з вялікім уздымам прынялі прывітальнае пісьмо Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Слава герояў неўміручая! Подзвігу абаронцаў Брэсцкай крэпасці вечна жыць у памяці народаў!

ДЛЯ ДАБРАБЫТУ НАРОДА, У ІМЯ КАМУНІЗМА

IV УСЕСАЮЗНЫ З'ЕЗД АРХІТЭКТАРАЎ ЗАКОНЧЫЎ РАБОТУ

Тры дні ў Вялікім Крамлёўскім Палацы працаваў IV Усесаюзны з'езд архітэктараў. Ён усебакова і глыбока абмеркаваў задачы, якія стаяць перад дойлідамі краіны. Выступленні дэлегатаў былі прасякнуты гарачым імкненнем ствараць будынкі і збудаванні, вартыя савецкага народа — будаўніка камунізма. Будаваць хутка, эканамічна, прыгожа, высакаякасна — такое патрабаванне партыі, народа да архітэктара, будаўніка. Аб тым, як гэта патрабаванне ажыццявіць, ішла размова ў Крамлі.

Бурнымі працяглымі апладысментамі сустрэлі дэлегаты прапанову паслаць пісьмо Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і Савету Міністраў СССР. Зачытваецца тэкст пісьма.

З'езд архітэктараў ад імя ўсіх дойлідаў краіны горача дзякуе Цэнтральнаму Камітэту КПСС і Савету Міністраў СССР за цёплыя словы, выказаныя ў прывітанні з'езду, за вялікія клопаты аб далейшым развіцці сацыялістычнага дойлідства. Для савецкіх архітэктараў, гаворыцца ў пісьме, няма больш высокай і ганаровай задачы, чым творчае служэнне свайму народу.

Удзельнікі з'езда запэўніваюць Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і Савет Міністраў СССР, што архітэктары не пашкадуюць сваіх сіл і творчай энергіі на карысць народа, у імя велічнай мэты — узвядзення светлага будынка камунізма.

Зноў грыміць авацыя.

З'езд выбраў новы склад праўлення і рэвізійнай камісіі Саюза архітэктараў СССР.

ТАСС.

Хорошая, рамантычная, песенная прафесія ў Жэні Цыганковай — будаўнік. Пра яе дзяўчына марыла яшчэ ў школе. А цяпер, пасля заканчэння прафесіянальна-тэхнічнага вучылішча яна па-ўдарнаму працуе на будаўніцтве жылых дамоў і адміністрацыйных будынкаў у Брэсце.

Фота А. ВЕЛІКАСЕЛЬЦА. (БЕЛТА).

ПРА ПЕСНІ, ПРА ЗАДУМЫ

Цікавая гаворка пра новыя песні кампазітараў рэспублікі, пра іх творчыя задумы адбылася ў нядзелю ў Мінскім цэнтральным магазіне «Ноты». Сюды прыйшлі Я. Цікоцкі, Д. Камінскі, І. Кузняцоў, М. Аладаў, М. Шнейдэрман. Наведвальнікаў магазіна было многа. Яны набывалі песні, прысвечаныя Радзіме, лірычныя творы, апрацоўкі народных песень. Кампазітары расказвалі, як ствараюцца песні, цікавіліся, якія творы любіць спяваць моладзь, давалі аўтографы.

Салісты Беларускага радыё, якія былі запрошаны на сустрэчу, выканалі творы Я. Цікоцкага, І. Кузняцова, М. Аладава і іншых кампазітараў.

АНСАМБЛЬ «ЛЕТУВА» Ў ВІЦЕБСКУ

У Палацы культуры ўпраўлення бытавога абслугоўвання 30 кастрычніка віцябляне ўпершыню прымалі Дзяржаўны заслужаны ансамбль песні і танца «Летува» Літоўскай ССР.

Госці выступілі з вялікай канцэртнай праграмай і пазнаёмілі з дасягненнямі песеннага і танцавальнага мастацтва свайго народа.

БЕЛТА.

ПАД ЗНАКАМ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ВЯЛІКІХ ДАТ

ПЛЕНУМ ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА РАБОТНІКАЎ КІНЕМАТАГРАФІІ БССР

Як паведамлялася ўжо, у Мінску адбыўся пленум праўлення Саюза работнікаў кінематаграфіі БССР. Ён абмеркаваў пытанні, звязаныя з падрыхтоўкай работнікаў беларускага кіно да 50-годдзя Вялікага Кастрычніка і 100-годдзя з дня нараджэння Ул. І. Леніна.

Ва ўступным слове сакратар праўлення Саюза работнікаў кінематаграфіі БССР М. Фігуроўскі расказаў пра работу, што правёў Саюз работнікаў кінематаграфіі за два гады пасля Першага з'езда беларускіх кінематаграфістаў.

Адбыліся два пленумы і 20 пасяджэнняў праўлення саюза, сказаў М. Фігуроўскі, прачытана шмат лекцый па тэорыі кіно і эстэтыцы, арганізаваны вечары французскага, польскага, шведскага кіно, вечары-сустрэчы з кінематаграфістамі Савецкага Саюза і замежных краін. Былі праведзены за гэты час творчыя канферэнцыі па беларускіх мастацкіх і дакументальных фільмах, два агляды-спаборніцтвы кінаработнікаў прыбалтыйскіх рэспублік і Беларусі, семінары кінасцэнарыстаў. Аднак, зазначыў М. Фігуроўскі, Саюз работнікаў кінематаграфіі яшчэ не мае сапраўднага ўплыву на творчую дзейнасць нашых кінастудый.

З дакладам аб падрыхтоўцы работнікаў беларускага кіно да вялікіх гістарычных дат у жыцці савецкага народа выступіў старшыня Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па кінематаграфіі Б. Паўлёнак.

У пачатку даклада Б. Паўлёнак спыніўся на тых агульных творчых задачах, якія стаяць зараз перад савецкай кінематаграфіяй. Потым ён перайшоў да аналізу работы беларускіх кінематаграфістаў.

— Гаворачы ў мінулыя гады пра кінастудыю «Беларусьфільм», — сказаў дакладчык, — мы пачыналі нашы прамовы словамі: на студыі складваецца малады творчы калектыў, і таму некаторыя недахопы, якія дапускаюцца ў рабоце і г. д. Абстаноўка пошукаў, эксперыментаў, давер'я да талентаў і добрых намераў маладых мастакоў памагла іх станаўленню. Я не буду пералічваць назвы фільмаў, якія характарызуюць нашы дасягненні. Хачу толькі сказаць, што пастаноўка такіх кінакарцін, як «Масква — Генуя», «Пісьмы да жывых», «Праз могілкі», «Горад майстроў», гаворыць пра тое, што пара дзяцінства для нашай студыі скончылася, што перад намі цяпер стаіць задача замацавання дасягнутых рубяжоў.

Дакладчык гаворыць пра тое, што нараджэнне большасці мастацкіх фільмаў, асабліва першых работ, адбывалася ў атмасферы вострай узаемнай крытыкі, у гарачых палемічных схватках. Гэта садзейчала агульнаму творчаму ўздыму, пачынаючыя мастакі пераадольвалі абмежаванасць светапогляду, недахопы перыяду вучобы.

Кіраўніцтва студыі і рэдакцыйна-сцэнарная калегія, абапіраючыся на ўказанні Камуністычнай партыі па ідэалагічных пытаннях, аддавалі вялікую ўвагу тэматычнаму плану, пастаноўцы гісторыка-рэвалюцыйных твораў і тых, якія адпавядаюць па сваёй тэме надзённым запатрабаванням сучаснасці, якія ўзнімаюць важныя пытанні жыцця нашага грамадства, камуністычнай маралі.

Аднак трэба сказаць, што мы яшчэ не стварылі буйнамаштабных твораў. «Масква — Генуя» пакуль адзіны за апошнія гады маштабны фільм. Прыгадаем прадукцыю, выпушчаную ў леташнім годзе і сёлета.

Блізка да таго, каб сказаць вялікае слова пра сапраўднага камуніста, пра веліч і прыгажосць подзвігу, падышлі драматург Алесь Кучар і рэжысёр Валянцін Вінаградаў. Іх фільм «Пісьмы да жывых» — вельмі сур'ёзная работа. Аднак асабістая трагедыя гераіні фільма Веранікі Карчэўскай становіцца часам вышэй за гераічны пачатак, фільму бракуе пафасу, паэтычныя сцэны часам перамяжоўваюцца з бытавымі. Карціна мае некаторую эскізнасць, недакладнасці ў пабудове сюжэта і таму гледачам некалькі цяжка яе ўспрымаць.

— На подступах да вялікай тэмы,— працягвае дакладчык, — зроблены Віктарам Туравым кінафільм «Праз могілкі». Ён жывапісны, паэтычны, чысты, пагружае нас у свет роздумаў герояў, у асяроддзе звычайных і разам з тым незвычайных людзей. Нягледзячы на камернасць дзеяння, карціна, па сутнасці, апавядае пра мільёны людзей, якія ўзняліся ў дні вайны на барацьбу з фашызмам па загадзе сэрца.

Своеасаблівае вырашэнне тэмы барацьбы народа за незалежнасць знайшоў рэжысёр Уладзімір Бычкоў, які экранізаваў казку Т. Габе «Горад майстроў». Ён парадаваў свежай і яркай работай, поўнай вясёлай выдумкі, гумару, вясёлага лірызму.

Станоўча ацаніла грамадскасць дзіцячы фільм Льва Голуба «Пушчык едзе ў Прагу», пастаўлены сумесна з чэхаславацкімі кінематаграфістамі. Займальна апавядае гэтая стужка пра дружбу савецкіх і чэшскіх дзяцей, пра хлапчукоўскую гордасць, пра вернасць дадзенаму слову.

На галоўных ідэйных напрамках знаходзяцца таксама нашы работы, над якімі сёння працуюць творчыя калектывы. Гэта — «Колькі лет, колькі зім!» Мікалая Фігуроўскага (яго ж сцэнарый), «Альпійская балада» Барыса Сцяпанава па сцэнарыі Васіля Быкава, «Я родам з дзяцінства» Віктара Турава па сцэнарыі Генадзя Шпалікава, «Іду шукаць» — рэжысёрскі дэбют Ігара Дабралюбава, «Чужое імя» Іосіфа Шульмана. Знаходзіцца ў рэжысёрскай распрацоўцы сцэнарый кінакамедыі Д. Вакулоўскай «Саша-Сашанька» — першы поўнаметражны фільм Віталія Чацверыкова. Рэдакцыйна-сцэнарнай калегіі ўдалося дамагчыся жанравай разнастайнасці фільмаў на працягу аднаго года.

Далей дакладчык спыняецца на характарыстыцы розных напрамкаў у творчасці рэжысёраў, гаворыць пра тое, што некаторыя мастакі, захапляючыся звыш меры пошукамі формы, пастаноўкай чыста мастацкіх задач, не заўсёды глыбока аналізуюць складаныя сацыяльныя працэсы, бяруць у аснову твораў факты, якія ляжаць на паверхні, пад рукой.

Толькі творчымі выдаткамі можна растлумачыць недахопы фільма «Крыніцы», зазначыў Б. Паўлёнак. У аснове твора ляжаць правільныя гістарычныя пасылкі, характэрныя з'явы рэчаіснасці нядаўняга мінулага. Але рэжысёр Іосіф Шульман не пайшоў на шляху псіхалагічнага паглыблення вобразаў, не паспрабаваў даследаваць унутраную сутнасць з'яў, а ўжыў гатовыя літаратурныя і кінематаграфічныя штампы, па-лабавому расказаў пра складаныя з'явы жыцця.

Далей дакладчык спыніўся на пытаннях пракату беларускіх кінакарцін, прывёў лічбы, якія сведчаць пра тое, што некаторыя беларускія фільмы не атрымалі прызнання гледачоў. Ён прааналізаваў прычыны такога становішча. На многіх нашых фільмах апошніх гадоў, адзначыў Б. Паўлёнак, заўважаецца адбітак коснаязыкасці, ілжывай шматзначнасці, а практычна — адбітак бесканфліктнасці, дэдраматызацыі. Кожны эпізод сам па сабе востры, а выстраяцца эпізоды ў творы, і атрымліваецца нешта накшталт расчоскі — кожны зуб доўгі і калючы, а правядзеш далонню па ўсіх зубах — толькі шчокатна стане.

Цяжка нараджалася апошняя работа Рычарда Віктарава «Каханая». Сцэнарый Алега Стукалава па аповесці М. Пагодзіна «Бурштынавыя каралі» пры сустрэчы з акцёрамі і здымачнай камерай разбіўся на дробныя канфлікты, дробныя праблемы, патануў у пустых, ілжыва шматзначных рэпліках. Нягледзячы на вельмі вялікую работу рэжысёра, на сур'ёзныя пераробкі сцэнарыя і ў ходзе здымак, і ў перыяд мантажу Р. Віктараву не ўдалося да канца пабудаваць драматургію фільма ні па лініі сацыяльнай, ні па лініі асабістай.

Потым Б. Паўлёнак расказваў пра тое, як студыя «Беларусьфільм» рыхтуецца сустрэць 50-годдзе Савецкай улады.

Аркадзь Куляшоў і Максім Лужанін скончылі работу над літаратурным сцэнарыем «Радыё ўсім», прысвечаным падзеям Вялікага Кастрычніка на Заходнім фронце, на зямлі Беларусі. Пастаноўка фільма даручана Уладзіміру Корш-Сабліну.

Знаходзіцца на разглядзе сцэнарый Канстанціна Губарэвіча «Дзе ты, Анюта?» Гэта павінен быць таксама гісторыка-рэвалюцыйны фільм, разлічаны на дзіцячага гледача. Работа прызначаецца для рэжысёра Льва Голуба.

Юбілейным фільмам будзе новая работа Аляксея Спешнева «Тысяча вокнаў». Будучы фільм раскажа пра нашу моладзь.

Працуюць над сцэнарыем пра гераічнае партыйнае і партызанскае падполле ў Беларусі драматург А. Кучар і рэжысёр В. Вінаградаў.

Пішуцца сцэнарыі на гістарычныя і гісторыка-рэвалюцыйныя тэмы, пра савецкіх чэкістаў, пра мужную барацьбу камуністаў у гады падполля.

— Аднак, — сказаў дакладчык, — у сцэнарным партфелі студыі няма буйных сцэнарыяў мастацкіх фільмаў пра сучаснасць. Рэдакцыйна-сцэнарная калегія ўдзяляе нямала ўвагі гістарычнаму матэрыялу, забяспечвае студыю сцэнарыямі пра першыя гады Савецкай улады, Вялікую Айчынную вайну. Трэба па-сапраўднаму расчыніць дзверы творам пра сучаснасць.

Дакладчык пераходзіць да аналізу творчасці беларускіх кінадакументалістаў, гаворыць, што ў іх намеціліся пэўныя станоўчыя зрухі ў рабоце. Кінадакументалісты пераканальна адлюстроўваюць наша мінулае і сучаснае жыццё.

Высокую ацэнку грамадскасці атрымалі дакументальная карціна «Вызваленне Савецкай Беларусі», знятая яшчэ ў гады вайны і сёння нанава пераманціраваная, яркая работа драматургаў Анатоля Вялюгіна, Рыгора Няхая і рэжысёра Іосіфа Вейняровіча «Дарога без прывалу». Карыстаюцца поспехам такія стужкі, як «Есць такая зямля», «Экран, час, жыццё», «Высокае напружанне», «Глыбокі гарызонт», «Дзень перамогі», «Будні саляных забояў», «Школа гімнастыкі», «Экіпаж светлавераў», рад спецвыпускаў па мастацтву, навукова-папулярных і відавых карцін.

На жаль, нашы дакументалісты, гаворыць Б. Паўлёнак, у некаторых сваіх работах часта ідуць па лініі найменшага супраціўлення. Такія фільмы, як «Сучасніца» (рэжысёр С. Браудэ), «Светлагорск» (рэжысёр А. Ястрабаў), «У адным страі» (рэжысёр С. Прошын), «Сказ пра садавода» (рэжысёр Ул. Стральцоў) зроблены рознымі мастакамі. Але гаварыць пра іх творчую індывідуальнасць не прыходзіцца. Карціны на дзіва падобныя адна на адну. Праўда жыцця тут не становіцца праўдаю мастацтва.

У беларускім дакументальным кіно ўсё часцей і больш эфектыўна прымяняецца метад назірання жыцця і мастацкае асэнсаванне гэтых назіранняў. На экранах рэспублікі ідуць фільмы «Сорак трэцяя вясна» (рэжысёр В. Сукманаў), прысвечаны Беларускаму універсітэту, «Ноч адгукаецца» (рэжысёр Ул. Скітовіч) — аб працы начных тэлефаністак. На жаль, рэжысёры, назіраючы жыццё, не сфармулявалі выразна сваю задачу, не адкрылі за фактамі глыбокія жыццёвыя з'явы. На экране дробныя, нязначныя размовы і думкі, шэранькае, нуднае жыццё.

І, карыстаючыся тым жа метадам назірання, працуючы з вельмі цяжкім матэрыялам, рэжысёры С. Фрыд і Р. Ясінскі дамагліся значнага мастацкага эфекту ў сваіх фільмах «Урок даўжынёю ў год» і «Наш клас праз год».

— Прычыны няўдач кінадакументалістаў, — адзначае дакладчык, — у многім абумоўлены недахопамі ў рабоце сцэнарнага аддзела студыі навукова-папулярных і хранікально-дакументальных фільмаў. Некалькі разоў на працягу года давялося карэкціраваць, удакладняць, мяняць планы студыі. Рэдка які фільм здаецца без значных паправак мантажу або тэксту. Усё гэта выклікае празмерную напружанасць у рабоце, падаражае кошт фільмаў.

Дакладчык гаворыць пра тыя вялікія і пачэсныя задачы, што стаяць перад беларускімі кінадакументалістамі, расказвае пра план здымкаў дакументальных фільмаў. Плануецца зняць поўнаметражны фільм, які раскажа пра людзей розных пакаленняў, што змагаліся за ўстанаўленне Савецкай улады на Беларусі, рад кінанарысаў.

Потым Б. Паўлёнак пераходзіць да вытворчых пытанняў, гаворыць пра неабходнасць паляпшэння работы творчых груп і вытворчых цэхаў на абедзвюх студыях.

— Мы не выкарыстоўваем, —сказаў ён, — каласальныя рэзервы вытворчасці, асабліва ў здымачны перыяд. Рэжысёры і аператары часам адцягваюць увагу на дробязі, якія нярэдка надоўга выводзяць іх з творчага стану і адбіваюцца не толькі на прадукцыйнасці працы здымачнай групы, але і на якасці фільма.

Шмат часу ідзе на падрыхтоўчыя работы, на здымкі шматлікіх дубляў, даздымкі і пераздымкі. Не заўсёды добра працуюць вытворчыя цэхі. Лабараторыі затрымліваюць апрацоўку матэрыялу, а гэта ў сваю чаргу не дае магчымасці рыхтавацца да здымкаў наступных кадраў. Не заўсёды знаходзіцца ў добрым тэхнічным стане здымачная апаратура, таму часам аператары не ведаюць, ці атрымаюцца ў іх знятыя планы. На нашу думку, гаворыць дакладчык, на студыі «Беларусьфільм» трэба ўвесці сістэму якаснай ацэнкі работы вытворчых цэхаў, узгадніць іх працу.

— Каб ажыццявіць усе меры, накіраваныя на дастойную сустрэчу 50-годдзя Вялікага Кастрычніка, — сказаў у заключэнне Б. Паўлёнак, — неабходна прарабіць вельмі вялікую работу. У ёй павінны прыняць удзел усе творчыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі, грамадскасць і ўвесь вытворчы персанал нашых студый, Саюз работнікаў кінематаграфіі БССР.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

ПРЫСВЯЧАЕЦЦА СЛАЎНАЙ ГАДАВІНЕ

У гарадах і вёсках рэспублікі пачаўся шырокі паказ прысвечаны 48-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі.

У праграме паказу мастацкія кінакарціны «Ленін у Кастрычніку», «Ленін у 1918 годзе», «Зары насустрач», «Дэпутат Балтыкі», «Імем рэвалюцыі», «Аптымістычная трагедыя», «Разлом», «Школа мужнасці», «Якаў Свярдлоў» і іншыя.

Выпускаецца таксама на экраны рэспублікі новая мастацкая кінааповесць «Бура над Азіяй», створаная рэжысёрам К. Ярматавым на кінастудыі «Узбекфільм».

Яна прысвечана рэвалюцыйным падзеям ва Узбекістане ў Кастрычніцкія дні 1917 года.

Побач з мастацкімі фільмамі ў кінатэатрах і клубах рэспублікі будуць шырока дэманстравацца дакументальныя гісторыка-рэвалюцыйныя стужкі, а таксама хранікальна - дакументальныя кінафільмы, прысвечаныя грамадзянскай вайне, першым пяцігодкам, подзвігу савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, мірнаму будаўніцтву.

ХРОНІКА ЛІТАРАТУРНАГА ЖЫЦЦЯ

ТВОРЧЫЯ СПРАВАЗДАЧЫ

Днямі секцыя дзіцячай і юнацкай літаратуры Саюза пісьменнікаў БССР заслухала творчую справаздачу В. Хомчанкі. Даклад зрабіў Ул. Юрэвіч. Ён разгледзеў дзве кнігі пісьменніка—«Верны рыцар» і «Чырвоны мак». Свае думкі аб гэтых кнігах выказалі таксама А. Якімовіч, Ул. Жыжэнка, А. Пальчэўскі, С. Міхальчук.

Секцыя вырашыла заслухаць у бліжэйшы час творчую справаздачу паэта Хв. Жычкі.

ЧАТЫРОХТОМНЫ ЗБОР ТВОРАЎ МАКСІМА ТАНКА

Выданне першага, найбольш поўнага збору твораў выдатнага беларускага паэта Максіма Танка пачало выдавецтва «Беларусь».

У чатырохтомнік, акрамя знаёмых ужо масаваму чытачу вершаў, будуць уключаны многія малавядомыя да гэтага часу творы, якія калісьці былі канфіскаваны польскай цэнзурай, рассеяны па розных газетах, часопісах, і тыя, што заставаліся ў рукапісах.

Вялікую цікавасць для чытачоў маюць артыкулы на літаратурныя тэмы, фрагменты з дарожных дзённікаў, запісан, а таксама пераклады з літаратур брацкіх народаў.

Рыхтуючы да друку гэтае выданне, аўтар унёс значныя паправкі ў ранейшыя тэксты, многія творы здрэдагаваў.

Выданне намечана ажыццявіць у 1966—67 гадах.

НОВЫЯ П'ЕСЫ

У Магілёўскім аддзяленні Саюза пісьменнікаў БССР рэгулярна абмяркоўваюцца творы маладых драматургаў. Сяброўскія парады і дапамога прынеслі вялікую карысць. П'еса «Мурын бор» І. Ісачанкі прынята для пастаноўкі ў абласным драматычным тэатры. Напісалі п'есы маладыя драматургі К. Осіпаў, В. Атрашкевіч, А. Гаранін. Іх творамі зацікавіліся драматычныя калектывы Дамой культуры чыгуначнікаў і завода штучнага валакна.

ЖАДАНЫЯ ГОСЦІ

У гамяльчан пабывалі пісьменнікі А. Савіцкі, П. Прыходзька і Б. Спрынчан. Цёпла сустрэлі гасцей студэнты і выкладчыкі дарожна-будаўнічага тэхнікума. Алесь Савіцкі расказаў прысутным пра росквіт беларускай савецкай літаратуры, пра вялікую папулярнасць беларускіх выданняў за рубяжом. Потым П. Прыходзька і Б. Спрынчан прачыталі свае вершы, прысвечаныя савецкай моладзі.

Літаратурныя вечары з удзелам пісьменнікаў адбыліся ў Палацы культуры работнікаў мясцовай прамысловасці і мэблевай фабрыкі «Чырвоная зорка», на фабрыцы «Камінтэрн». На вечарах ішла гаворка пра новыя творы І. Мележа, І. Шамякіна, В. Быкава, чыталіся вершы.

РАСКАЗ ЗЕМЛЯКА

У Добрушскім раённым Доме культуры адбылася сустрэча чытачоў са сваім земляком Іванам Шамякіным. Ён расказаў аб творчай працы беларускіх празаікаў і паэтаў старэйшага пакалення, аб пісьменніках, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Затым пісьменнік расказаў, як працуе над сваімі творамі, пра планы і задумы.

Такія ж сустрэчы адбыліся ў вёсцы Карме, на радзіме пісьменніка, і ў вёсцы Агародні- Гомельскай.

ДВАЦЦАЦЬ ПЕРШЫ СЕЗОН

Спектаклем «Шануй бацьку свайго» пачаў свой 21-ы сезон Брэсцкі абласны тэатр імя ЛКСМБ.

У гутарцы з нашым карэспандэнтам галоўны рэжысёр тэатра, заслужаны артыст БССР Г. Волкаў расказаў:

— У сёлетнім сезоне мы пакажам брастаўчанам рад новых работ, падрыхтаваных у час нашых гастроляў на Украіне і ў Бабруйску. Гэта— спектакль «Шануй бацьку свайго» па п'есе В. Лаўрэнцьева, якім мы адкрылі сезон, а таксама «Каменьчыкі на далоні» А. Салынскага. У лістападзе наш калектыў выпусціць яшчэ адну прэм'еру — «Спякотнае лета ў Берліне» (інсцэніроўка па раману аўстралійскай пісьменніцы М. К'юсак). У спектаклі расказваецца пра сённяшняе жыццё «франтавога» горада Заходняга Берліна. Новы сезон паказальны яшчэ і тым, што мы ўстанавілі творчую сувязь з беларускімі драматургамі. А. Маўзон прапанаваў нам сваю п'есу «Куды ідзеш, Сяргей!», над якой цяпер працуе тэатр. Хутка ўбачыць святло рампы і першая п'еса маладога беларускага аўтара А. Дзялендзіка «Чатыры крыжы». Значна абнавіўся акцёрскі склад тэатра. У мінулыя гады ў нас не было моцнай маладзёжнай групы. Сёлета прыступілі да работы на нашай сцэне выпускнікі Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута Ж. Зарэмба, А. Папоў, І. Фядотава, В. Варонін. Новы спектакль «Сняжок» па п'есе В. Любімавай паставіць выпускнік Беларускага інстытута Ул. Серафімовіч.

ТЭАТРАЛЬНЫЯ ПРЭМ'ЕРЫ

Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы паказаў 30 кастрычніка прэм'еру — спектакль па п'есе Леаніда Лявонава «У мяцеліцу». Напісаная ў 1939 годзе, п'еса была аўтарам перапрацавана. У новай рэдакцыі яна ўпершыню ў краіне пастаўлена на сцэне Тэатра імя Янкі Купалы рэжысёрам Б. Эрыным.

Спектакль афармілі заслужаны дзеяч мастацтваў БССР А. Грыгар'янц, музыку напісаў народны артыст СССР Я. Цікоцкі, ролі выконваюць народная артыстка СССР Л. Ржэцкая, народныя артысты БССР М. Бялінская, Л. Рахленка, заслужаныя артысты БССР Г. Макараў, В. Тарасаў, П. Пекур, С. Хацкевіч і іншыя.

На здымку — у ролі Марфы Касьянаўны — артыстка Л. Ржэцкая, Сцяпана Сыраварава — артыст Л. Рахленка.

ПАД ЗНАКАМ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ВЯЛІКІХ ДАТ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Праз месяц у Маскве адбудзецца першы Устаноўчы з'езд Саюза работнікаў кінематаграфіі СССР. Радасна, што мастакі беларускага кіно ідуць да гэтага з'езда ідэйна-згуртаванымі, з пэўнымі поспехамі ў творчасці, поўныя жадання ствараць творы, вартыя нашага часу.

Пасля даклада разгарнуліся спрэчкі.

— Трэба перагледзець,—сказаў у сваім выступленні рэжысёр М. Фігуроўскі,—некаторыя палажэнні, звязаныя з работай вытворчых цэхаў студыі «Беларусьфільм». Неабходна адзяліць студыю ад фабрыкі, вытворчых цэхаў, якія займаюцца чыста тэхнічнымі пытаннямі, але сёння адказваюць за творчыя грахі рэжысёраў і аператараў. Па-другое, трэба даць рэжысёрам больш часу на мантажны перыяд. Бо здараецца так, што рэжысёр, пасля таго як закончыў здымкі, не мае часу асэнсаваць матэрыял, падумаць над тым, што ён наздымаў. Адсюль часам і ідзе мастацкі брак. Гэта пытанне вельмі важнае, бо вялікая доля работы ў стварэнні карціны прыпадае на мантажны перыяд.

Дырэктар карціны А. Жук падтрымаў думкі М. Фігуроўскага. Ён сказаў, што гэта пытанне трэба ставіць востра і прынцыпова. Неабходна хутчэй аддзяліць творчасць ад вытворчасці, каб, сапраўды, вытворчыя цэхі не адказвалі за простай творчых груп. Трэба таксама даваць больш часу на падрыхтоўчы перыяд пры вытворчасці фільма. Сёння на гэта даецца толькі два месяцы. Гэта вельмі мала, рэжысёры не паспяваюць добра падрыхтавацца да здымкаў. І трэба таксама,—сказаў далей А. Жук,—скарэціць здымачны перыяд. Ён занадта доўгі, цягнецца некалькі месяцаў. Нават тады, калі фільм агучваецца, рэжысёры працягваюць здымаць. Здымачны перыяд можна ўкласці ў тры месяцы. Неабходна стварыць на студыі добрыя вытворчыя цэхі, каб яны здолелі забяспечыць работу здымачных груп. Не вырашана на студыі «Беларусьфільм» і пытанне з «другім звяном»—другімі рэжысёрамі, другімі мастакамі, асістэнтамі. Людзей гэтых прафесій вельмі мала, часам яны некваліфікаваныя і ў здымачнай групе немагчыма наладзіць паралельную работу па падрыхтоўцы наступных сцэн. Гэта, зразумела, адмоўна адбіваецца на якасці здымачных работ.

Член рэдакцыйна-сцэнарнай калегіі «Беларусьфільма» К. Губарэвіч узняў пытанне аб адказнасці студыі за зробленую прадукцыю. Сёння ні студыя, ні рэжысёр не адказваюць, напрыклад, за правал фільма ў пракаце. Хочацца, каб гэтыя пытанні былі ўзняты на першым з'ездзе Саюза работнікаў кінематаграфіі СССР. Потым прамоўца падрабязна спыніўся на рабоце сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі. Ён расказаў, якія сцэнарыі ёсць у рэдакцыйным партфелі, якія заказваюцца. Сёлета ўжо запушчаны ў вытворчасць або рыхтуюцца да запуску ўсё пяць карцін наступнага года. Тут фільмы на розныя тэмы. Адзін з іх раскажа пра гісторыка-рэвалюцыйныя падзеі, другі фільм будзе зроблены для дзяцей, трэці—сатырычная камедыя. Аднак, сказаў далей К. Губарэвіч, мы сёння не можам даць ніводнага сцэнарыя пра сучаснасць. Пэўныя захады ў гэтым кірунку робяцца, студыя заключыла некалькі дагавораў з аўтарамі, і, відаць, неўзабаве некаторыя сцэнарыі можна будзе прапанаваць для здымкаў.

— У нас не хапае,—гаворыць прамоўца,—сцэнарыстаў. У апошні час з'явілася многа добрых кніг, напісаных беларускімі пісьменнікамі. Па гэтых творах можна было б паставіць фільмы. Але пісьменнікі вельмі неахвотна бяруцца за стварэнне сцэнарыяў, да таго ж яны не маюць пэўнай прафесіянальнай падрыхтоўкі для работы ў кіно. І таму нам трэба наладзіць падрыхтоўку высокакваліфікаваных сцэнарыстаў і праз Усесаюзны інстытут кінематаграфіі, і праз Вышэйшыя сцэнарныя курсы, і праз семінары. Трэба таксама паставіць пытанне аб арганізацыі спецыяльнай сцэнарнай майстэрні пры студыі «Беларусьфільм».

Аператар «Беларусьфільма» А. Булінскі зазначыў, што тэматычны план работы студыі па сутнасці складваецца стыхійна. Прамоўца спыніўся на рабоце сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі студыі, мастацкага савета, гаварыў пра недахопы ў арганізацыі іх творчай дзейнасці. Ён закрануў таксама пытанне аб стварэнні «другога звяна»—другіх рэжысёраў, мастакоў, асістэнтаў. Работа аператара, сказаў ён, мае пэўную спецыфіку і таму нельга падыходзіць да яе з агульнай меркаю. Неабходна, зазначыў А. Булінскі, стварыць у Мінску Дом кіно. Прамоўца закрануў таксама пытанне аб творчай прынцыповасці. Работнік кіно, сказаў ён, павінен стаяць да сваёй справы з усёй патрабавальнасцю і не браць за такія недабраякасныя сцэнарыі, як «Каханая» А. Стукалава, бо гэта прыводзіць да браку.

— Мы расказваем у сваіх фільмах галоўным чынам пра мінулае,—сказаў рэжысёр «Беларусьфільма» П. Васілеўскі.—Мінулым захапляюцца нават маладыя рэжысёры. А нам трэба шырэй расказваць пра сучасніка. Сённяшні глядач значна вырас, ён разумее многія кінематаграфічныя «тонкасці», тыя падтэксты, якія ўкладваюць у сюжэт аўтары, і трэба ствараць фільмы іменна для такога адукаванага гледача — фільмы на ўзроўні лепшых савецкіх карцін, такіх, як «Старшыня».

Галоўны рэдактар Мінскай студыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў С. Прошын падрабязна спыніўся на рабоце беларускіх кінадакументалістаў, расказаў, якія фільмы ставяцца і запланавана паставіць напярэдадні вялікіх гістарычных дат—50-годдзя Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі і 100-годдзя з дня нараджэння Ул. І. Леніна. Плануецца зняць поўнаметражны дакументальны фільм, які раскажа пра падзеі на Беларусі ў перыяд ад Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі да сённяшняга дня. Дакументальныя стужкі раскажуць пра рэвалюцыйнае мінулае нашай рэспублікі, пра электрыфікацыю Беларусі і г. д.

С. Прошын узняў таксама пытанне аб наладжванні творчай вучобы работнікаў кіно, гаварыў пра неабходнасць арганізаваць пракат дакументальных стужак, стварыць у Мінску спецыяльны кінатэатр дакументальных фільмаў.

Раду творчых пытанняў, характарыстыцы фільмаў, створаных работнікамі беларускага кіно, прысвяціла сваё выступленне кінакрытык Е. Бондарава. Аператар І. Пікман спыніўся на праблемах асваення каляровых здымкаў на «Беларусьфільме». Аператар Ю. Марухін узняў пытанне аб недастатковай загружанасці творчых работнікаў на студыі «Беларусьфільм». Трэба, сказаў ён, каб аператары мелі пастаянную загрузку, бо калі яны знаходзяцца ў прастоі, пачынаюць дэкваліфікавацца. Таму неабходна часцей выкарыстоўваць іх на здымках у іншых фільмах або пасылаць, калі ёсць магчымасць, на іншыя студыі краіны. Рэжысёр В. Вінаградаў гаварыў пра складанасць работы над фільмам «Пісьмы да жывых», пра тое, што працаваць на такіх студыях, як «Беларусьфільм», цяжка. Тут часам не стараюць рэжысёрам спрыяльных умоў для працы. І гэта адмоўна ўплывае на якасць здымаемай карціны.

Сваімі думкамі аб рабоце беларускіх кінематаграфістаў падзяліліся маскоўскія рэжысёры Р. Грыгор'еў і М. Швейцар.

Р. Грыгор'еў, рэжысёр Цэнтральнай студыі дакументальных фільмаў, ахарактарызаваў сённяшняе становішча ў савецкім дакументальным кіно. Ён расказаў пра лепшыя савецкія фільмы, добра адгукнуўся аб беларускай стужцы «Дарога без прывалу» (сцэнарый А. Вялюгіна і Р. Няхая, рэжысёр І. Вейняровіч). Гэты фільм, сказаў ён, робіць моцнае ўражанне.

Параўноўваючы сённяшнія работы беларускіх кінадакументалістаў з тымі, што рабіліся ў нядаўнім мінулым, Р. Грыгор'еў зазначыў, што сёння ў рабоце беларускіх дакументалістаў наглядаюцца значныя творчыя зрухі. З дакументальных фільмаў знікаюць інсцэніроўкі, стужкі становяцца больш праўдзівыя, непасрэдныя. Прамоўца станоўча ацаніў фільм «Будні саляных забояў», у якім, на яго думку, ёсць добрыя дэталі, праўдзіва перададзены падзеі. Добры таксама фільм «Сведкі вечнасці», праўда, ён не роўны ў мастацкіх адносінах.

— Без іправых момантаў,—сказаў далей Р. Грыгор'еў,—зроблены фільм «Наш клас праз год» С. Фрыда, Р. Ясінскага і А. Браслаўскага. Глядач з вялікай цікавасцю сочыць за жыццём дзяцей. Але гэты фільм мала чым адрозніваецца ад першага фільма аўтараў «Урок даўжынёю ў год». Трэба было б здымаць гэты клас гадоў праз шэсць. Потым Р. Грыгор'еў закрануў работу Саюза работнікаў кінематаграфіі, сказаў, што яе трэба актывізаваць. Члены саюза павінны мець магчымасць глядзець «сыры» кінаматэрыял здымаемых фільмаў, абмяркоўваць яго, і гэтым яны дапамогуць рэжысёрам.

— На студыях,—сказаў у сваім выступленні рэжысёр «Масфільма» М. Швейцар,—павінна панаваць атмасфера вялікай патрабавальнасці. Мы павінны ўзняць прафесіянальны ўзровень нашых кінематаграфістаў, не рабіць скідак на актуальную тэму, як гэта часам здаралася ў нас раней. Трэба вырашыць пытанне, сказаў далей прамоўца, аб адносінах паміж вытворчымі цэхамі студыі і творчымі работнікамі. Часам вытворчы прапэс не адпавядае «тэхналогіі» мастацтва.

Пасля спрэчак з заключным словам выступіў старшыня Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па кінематаграфіі Б. Паўлёнак.

Пленум прыняў пастанову, якая патрабуе ад беларускіх работнікаў кіно актыўнай падрыхтоўкі да выдатных гістарычных дат—50-годдзя Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі і 100-годдзя з дня нараджэння Ул. І. Леніна, заклікае да стварэння твораў высокаідэйных, змястоўных, цікавых па форме, якія будуць выхоўваць савецкіх людзей у духу камунізма.

На пленуме адбыліся давыбары дэлегатаў на першы Усесаюзны з'езд работнікаў кінематаграфіі.

НЕ ВЫПАДКОВАЕ СУСЕДСТВА

ПА ВЫСТАВАЧНЫХ ЗАЛАХ

У мастацкім салон-магазіне на Ленінскім праспекце ў Мінску — чарговая персанальная выстаўка. На гэты раз экспануюцца творы двух мастакоў — Л. Шчэмелева і М. Якавенкі.

Леанід Шчэмелеў выставіў работы, зробленыя ў час паездак на поўнач і поўдзень краіны і выкананыя па эцюдах у майстэрні.

Першае, што хочацца адзначыць, — непасрэднасць аўтарскага выказвання, разнастайнасць сюжэтаў, матываў, тэм, характараў персанажаў. У работах Л. Шчэмелева — высокі прафесіяналізм і нават віртуознасць. Праўда, часам віртуознасць пераходзіць проста ў любаванне тэхнічнымі дасягненнямі, як гэта, напрыклад, відаць у партрэце Людачкі і некаторых іншых палотнах.

Пра што апавядае мастак? Вось малюнкі і жывапісныя работы, зробленыя яўна з натуры. У малюнках жывая, пластычна выразная, дынамічная лінія. На адным з іх бачым дагестанак на вуліцы — добра перададзены характэрны рух людзей, іх адзенне, паўднёвая абстаноўка. Вось яшчэ адзін паўднёвы матыў. А вось паўночныя алені — які прыгожы па малюнку рытм іх рагоў! Добра зроблены партрэты людзей поўначы і поўдня з адмысловай растушоўкай — твар «прапрацоўваецца» многімі пукатасцямі, пэўным чынам узгодненымі між сабой. Добра адчуваецца этнічны тып. А вось пейзажы сіняй поўначы і жоўтага поўдня, выкананыя маслам...

На выстаўцы шмат бывае гледачоў. Яны доўга ходзяць, прыглядаюцца да работ. Што ім расказваюць карціны, акрамя вось гэтага чыста вонкавага апісання людзей і прыроды? Якія думкі, пачуцці ляжаць глыбей — пад фарбамі, лініямі?

І тут трэба звярнуцца да больш сур'ёзных, сюжэтных работ мастака, якія зроблены па эцюдах у майстэрні і над якімі, відаць, аўтар больш думаў. Гэта даволі вялікія палотны «Дагестанкі», «Таварышы», «Сненданне», «Людзі поўначы» і іншыя. Хоць яны розныя па сюжэтах, па тыпажы — у іх ёсць і нешта агульнае. І галоўнае ў гэтых палотнах — не вонкавае апаўданне, якое чытаецца па сюжэце (людзі сядзяць, снедаюць або плывуць па моры ў лодцы, таварышы за сталом і да т. п.), а другое, больш унутранае, нават філасофскае. Амаль у кожнай карціне ёсць персанаж, які глядзіць проста на гледача і быццам заклікае яго прыняць удзел у роздуме, пранікнуць у змест падзеі. Гэты персанаж не пазіруе, ён быццам пра нешта пытае, кліча падумаць, але... у той жа час замыкаецца ў сабе, у сваім роздуме. І гэтак жа, як ён, паглыблены ў роздум людзі, што сядзяць побач. Тут, у карцінах, яны не столькі звяртаюцца адзін да аднаго, колькі кожны сам сабе пра нешта думае, і такім чынам унутраны свет гэтых людзей аддзяляе іх адзін ад аднаго, быццам тысячы кіламетраў. Яны — разам. І ў той жа час — адасоблены...

Расшыфраваць тое, над чым думаюць персанажы, у нейкай ступені дапамагае фармальнае вырашэнне карцін. Прыглядаючыся да таго, што гавораць спалучэнні колераў, ліній ва ўсёй масе карцін, пачынаеш адчуваць, што аўтар імкнуўся сказаць пра нешта трывожнае, крыху нават дысгарманічнае. Л. Шчэмелеў спалучае рэзкія, кантрасныя, прыглушаныя па гучанні колеры, і гэта нават часам даходзіць у яго да дэкаратыўнай абстрактнасці, як, напрыклад, у партрэце Людачкі, дзе выкарыстана белае (адзенне дзяўчынкі) і цёмнае (інтэр'ер), што «гучыць» прыгожа, але трошкі холадна. Праўда, ёсць і больш канкрэтная думка ў гэтым палатне — дзіця бачыцца нам як белае поле, чыстае, яснае, а свет, у якім яно жыве, хаця таксама па-свойму чысты, але зусім інакшы, магчыма, нават чужы. Хто ведае, можа такую думку і не хацеў выказаць аўтар, але ж яна чытаецца...

Работы маслам Л. Шчэмелева крыху жорсткія па лінейнаму вырашэнню, па спалучэннях колераў. Часам у іх заўважаецца нерухомасць, якая мяжуе са скаванасцю. Людзі быццам наўмысна пазбаўляюцца рухаў.

Аўтар захапляецца дэкаратыўным вырашэннем тых ці іншых сюжэтаў, супастаўленнем колераў. Ён хоча гэтым выказаць нейчую думку. У такім падыходзе знешні свет становіцца для яго не столькі аб'ектам адлюстравання, колькі пачатковым, зыходным пунктам для выказвання пэўнага суб'ектыўнага погляду, і ён не вельмі глыбока пранікае ў натуру. У выніку і поўдзень, і поўнач, якія адрозніваюцца даволі рэзка, у аўтара «гучаць» амаль аднолькава (калі адкінуць тыпаж і не прымаць пад увагу не такую ўжо вялікую розніцу асноўных колераў: жоўтага і сіняга; гэтыя колеры ў Л. Шчэмелева — не столькі сутнасць пясчанай пустыні або халоднай поўначы, колькі іх знешнія прыкметы).

У карцінах Л. Шчэмелева, на мой погляд, нельга знайсці закончанай уласнай манеры расказу. Хоць яна і арыгінальная, і «мова» другіх мастакоў у аўтара старанна пераасэнсавана, але часам ясна адчуваеш першапачатковыя вытокі. Гэта і Ракуэл Кент, які па-свойму адкрыў поўнач і пасля якога цяжка асэнсаваць яе па-новаму, гэта і Сар'ян і Абягян, якія, хоць аўтар і «перапрацаваў» іх у колерных адносінах, усё ж яшчэ чытаюцца па нейкіх прыкметах кампазіцыі і асабліва па характарным тыпажы. Аўтар, мне знаецца, яшчэ не знайшоў сваёй індывідуальнай манеры пісьма, хоць і падышоў да яе блізка. Поўнач удалася яму лепш, ён здолеў схапіць нейкія яе адметныя рысы, хоць і тут холад недастаткова халодны і мора не раскрываецца сваёй крышталёна чыстай ледзяной вадой. Але поўдзень, мне здаецца, аўтару зусім не ўдаўся. Тут не адчуваецца ні пяску пустыні, ні таго, што ён дыхае гарачынёю, не адчуваецца, што людзі абпалены сонцам свайго краю.

Але, магчыма, у аўтара не было і намеру аб'ектыўна адлюстраваць убачанае? Магчыма, знешняя натура яго цікавіла як пасрэднік для выказвання свайго «я»? Але ў такім выпадку, відаць, патрэбна абавязкова знайсці сваю ўласную тэму, каб імкненне перадаць думку, настрой выказалася досыць поўна і ў той жа час без гвалту над прыродай.

Тут жа ў зале выстаўлены і скульптуры Мікалая Якавенкі, створаныя ў розныя гады. Многія з іх былі ўжо на выстаўках, а цяпер іх можна агледзець усе разам. Іх суседства з работамі Л. Шчэмелева не выпадковае. Яны блізкія па духу, па імкненню да абагуленасці, хоць сэнсавае напаўненне скульптур іншае.

У нас ужо не раз гаварылася пра абагуленасць работ М. Якавенкі, пра выразнасць іх пластыкі. Калі глядзіш некалькі твораў скульптара, якія дапаўняюць адзін аднаго, ясней адчуваеш асноўны напрамак яго пошукаў. М. Якавенка імкнецца выявіць духоўную сілу і фізічную моц чалавека і ў той жа час паказаць яго прыгажосць. Такое чытаецца ў яго скульптурах «Рабочы» і «Работніца». Тут мяккі, ураўнаважаны, замкнёны ў самім сабе рытм цякучых ліній. Пагляд спыняецца на прыгожым, абагулена вырашаным валявым мужчынскім твары, пераходзіць уніз па выцягнутых на ўсю іх даўжыню руках у рукавіцах, якія спакойна ляжаць на каленях, падобныя да нейкіх магутных прылад працы. Рух рук «Работніцы», якая абхапіла сагнутыя калені, больш мяккі, жаноцкі, але ў той жа час адчуваеш іх сілу.

У гэтых скульптурах, як і ў «Рыбаку» і ў некаторых іншых фігурах, адчуваецца хоць і вялікая, але ўсё ж чалавечая сіла. А вось у скульптуры «Хакеісты», якая складаецца з дзвюх фігур, аўтар, па-мойму, наўмысна падкрэсліў звышчалавечую сілу спартсменаў. Ён пасадзіў іх у позу егіпецкіх фараонаў і надаў ім звышмагутныя торсы. Таніраваная пад сталь скульптура асацыятыўна звязваецца ў нашым уяўленні з людзьмі жалезнымі ў літаральным значэнні гэтага слова. Пад сталёвымі аблонкамі адчуваецца цэлая гама такіх жа сталёвых мускулаў і касцей. Твары хакеістаў па-мужчынску прыгожыя і падобныя адзін да аднаго. Але такое рашэнне, на мой погляд, успрымаецца не як сатыра, а як жарт.

Тут жа знаходзіцца і «Хірург», вядомы па мінулых выстаўках. З гэтага масіўнага, бліскучага, здаецца, толькі крыху прамадэліраванага «каменя» раптам выпраменьваецца востры, разумны, бязлітасны і ў той жа час збавіцельны погляд чалавека, якому можна даверыцца для самай складанай аперацыі.

Прыгожыя па сілуэту невялікія жаночыя фігуры — «Эцюды».

Хочацца адзначыць уменне М. Якавенкі дакладна знайсці матэрыял і фактуру скульптуры. Яго «Рыбак» — зялёны, бліскучы, быццам частка марской стыхіі. Хакеісты — жалезныя. Рабочы — з чыстага цэменту, шэравата-блакітны. Работніца — з больш цёмнага цэменту. Хірург — з паліраванага, мякка мадэліраванага граніту — сама бліскучая паверхня і мяккія лініі нібы гавораць пра востры, тонкі, разумны нож урача.

Работы Л. Шчэмелева і М. Якавенкі не пакідаюць гледача раўнадушным. За сталом пішуць водгукі аб выстаўцы, у зале часта можна пачуць спрэчкі. І гэта сведчыць, што пошукі мастакоў — плённыя, што мастакі здолелі адлюстраваць нейкія з'явы нашага жыцця, што яны настойліва шукаюць сябе ў мастацтве — сваю індывідуальнасць.

Віктар ГОВАР.

Г. Глебаў у ролі Тулягі.

АКЦЁРЫ І РОЛІ

СМЕХ ТУЛЯГІ

Колькі дзён назад у Купалаўскім тэатры адбылося сапраўднае свята. У спектаклі «Хто смяецца апошнім», які калектыў аднавіў у мінулым сезоне, зноў браў удзел выдатны майстра сцэны Глеб Глебаў. Ён выйшаў на сцэну ў сваёй кароннай ролі Тулягі, у якой не выступаў ужо амаль дзесяць год.

Сустрэча з такім акцёрам, як Глебаў, — сапраўдная радасць, і, зразумела, гледачы, якія да адказу запоўнілі тэатр, перш за ўсё сачылі за Тулягам.

Вось ён уварваўся на сцэну страшэнна напалоханы. Туляга баіцца. Баіцца ўсяго на свеце. Страх — спадарожнік ягонага жыцця. Туляга баіцца нават выпрастацца ва ўвесь рост. Ходзіць ён нясмела — кароткімі, мяккімі, нейкімі вельмі ціхімі крокамі. Рухі яго рук таксама кароткія і баязлівыя. Неспакойна азіраецца, водзіць наўкруг нім прадстаўленні — менш за ўсё карыстаецца аднафарбным прынцыпам Мальера, у творах якога выдатныя вобразы ўсё ж не разгортваюцца далей адной якой-небудзь рысы: скупы — толькі скупы, Дон-Жуан — толькі Дон-Жуан.

Глебаўскі Туляга—баязлівец, але і... Ён хоча, вельмі хоча быць і чалавекам.

Гэта пацвярджае асабліва адна сцэна спектакля. Туляга, абняслаўлены, тэрарызаваны Гарлахвацкім, прыгорблены, хоча ціха прайсці, каб яго не заўважылі. Здаецца, скрозь зямлю праваліўся б, толькі б яго не бачылі, не гаварылі з ім, толькі б забыліся пра яго існаванне. А тут як на тое Вера спыніла яго, загаварыла. Яна не верыць у тое, што Туляга сапраўды заляцаўся да Зіны Зёлкінай, што ён распуснік. Ад такога прызнання глебаўскі герой расчуліўся, узрушыўся да глыбіні душы. У другі раз не адважыўся б, магчыма, нават пабаяўся б, а цяпер ён увесь падаўся да Веры, цісне, трасе яе руку. На вачах буйныя слёзы. Душу працінае гэтая сцэна. Туляга цяпер не столькі смешны, колькі трагічны.

Неяк міжволі прыгадаліся наш даўні знаёмы Акакій Акакіевіч з гогалеўскага «Шыняля», вобразы тургенеўскіх камедый, словам, маленькія людзі, няшчасныя, гаротныя, дзівакаватыя, якія, па вельмі трапнаму вызначэнню Гогаля, выклікаюць смех скрозь слёзы. Перабіраю ў памяці вобразы, створаныя Глебавым, і не знаходжу такіх характараў. Вельмі шкада. Бо, хто ведае, калі б яны былі, можа тады б глебаўскі талент узнімаўся не толькі да вяршынь камедыйнага, але і да вяршынь трагікамічнага, можа менавіта Глебаў прадоўжыў бы традыцыі вялікага Мартынава...

Звернемся, аднак, зноў да сцэнічнага вобраза, прыглядзімся да акцёрскага майстэрства Глебава.

Такая — першая глебаўская заяўка на вобраз. І ў гэты вечар яна была сапраўды выдатнай.

Дзякуючы акцёрскаму таленту і майстэрству Глебава, вобраз Тулягі для гледачоў стаў назыўным. Гэтак жа, як хлестакоўшчына, маніла ўшчына, расплюеўшчына. Менавіта дзякуючы гэтаму, глебаўскі Туляга даўно ўжо ўвайшоў у гісторыю тэатра.

Аднак Глебаў — і гэта асабліва стала відавочным на апошнячыма, быццам бы ў кожным куце прыхаваўся яго працоўнік. Гаворыць Туляга ціха, прыглушана, каб, крый божа, не звярнуць на сябе ўвагі. Калі ж хто незнарок грукне ці данясецца адкуль шоргат — Туляга ажно дранцвее.

Неадольнае жаданне Тулягі стаць сапраўдным чалавекам дае яму яшчэ не сілу і ўпэўненасць. Дае далёкую, зыбучую надзею, што праўда ўсё ж адолее. Тулягу памагаюць людзі, і тады яго туманная надзея становіцца больш блізкай і рэальнай. Нарэшце Туляга стаў расказваць сакратару партарганізацыі праўду пра Гарлахвацкага. Не прама, адкрыта, а ў абход, кожны раз чапляючыся за выратавальнае «напрыклад», нібы і сапраўды гаворка вядзецца проста так, наогул.

Вось тады ён і ўсміхнуўся. Упершыню. І хто ведае — можа, за многія гады жыцця.

А потым Туляга і зусім рассмяяўся. Смяяўся доўга, моцна, задзірыста. Праўда, пад той час, калі ён застаўся адзін, калі яго ніхто не чуў і не бачыў. Шматгадовая боязь і страх праходзяць не адразу. Глебаў і тут ва ўсім лагічна паслядоўны, псіхалагічна пераканальны.

Так, нават у апошняй карціне спектакля, калі Гарлахвацкі выступае са сваім псеўданавуковым дакладам, калі ён вярэе ўсялякую лухту, Туляга яшчэ далёкі ад сваёй канчатковай перамогі. Ён раз-пораз аглядаецца па баках, пэўна, асэнсоўвае сітуацыю, узважвае ўсе «за» і «супраць». Туляга яшчэ і цяпер пабойваецца: а што, калі верх возьме Гарлахвацкі, зноў здолее ўсіх падманудь?

І ўсё ж дзесьці ў самым галоўным герой ужо не той, якім быў раней. Сядзіць на канапе, слухае Гарлахвацкага і ў самыя камічныя моманты, пераглядаючыся з іншымі людзьмі, злёгку гоцкаецца. Кпіць у душы з невука, смяецца. Толькі не ў голас, а паціху, пра сябе.

А вось нарэшце Гарлахвацкага поўнасцю выкрываюць. Усе разыходзяцца. І якраз у гэты час Туляга, усё адно як па волі лёсу, адзін на адзін сутыкнуўся з Гарлахвацкім. Спачатку неяк сумеўся, разгубіўся. А потым паглядзеў яму ў твар адкрыта, без боязі. І выпрастаўся ва ўвесь рост, мабыць таксама ўпершыню за доўгія гады жыцця. І гэта вельмі выразны акцёрскі штрышок — душэўнае выпрамленне поўнасцю супала з фізічным.

Туляга, перш чым урачыста, трыумфальна прайсці перад Гарлахвацкім, яшчэ раз глянуў на яго і ўсміхнуўся. І цяпер ужо смела, перад самым страшным для яго чалавекам. Усміхнуўся назло свайму ворагу.

Гэта была перамога Тулягі. Гэта была вялікая перамога і самога Глебава, які іграў сваю каронную ролю не толькі з такім майстэрствам, з якім іграў раней. Было ў вобразе Тулягі і штосьці новае, непаўторнае. У прыватнасці, здаецца, ніколі так выразна, хочацца нават сказаць — чыста, не гучалі ноткі «смеху скрозь слёзы». І гэта ў поўным сэнсе слова ўзрушала. Узрушала, мабыць, не толькі шматлікіх гледачоў, але і партнёраў Глебава па сцэне. Яны іграли ў гэты вечар з большым уздымам і натхнённем — быў прыклад.

Анатоль САБАЛЕЎСКІ.

АРТЫСТЫ — СЛУХАЧАМ УНІВЕРСІТЭТАЎ

У многіх раённых і сельскіх дамах культуры Мінскай вобласці праходзяць заняткі універсітэтаў культуры па тэме «Беларуская музычная культура». Слухачы універсітэтаў запрашаюць на заняткі артыстычныя калектывы рэспублікі. У Беразіно быў нядаўна запрошаны Беларускі дзяржаўны народны аркестр. Лекцыю, якая суправаджалася канцэртам, прачытаў народны артыст БССР І. Жыновіч. У канцэрце прымалі таксама ўдзел салісты Белдзяржфілармоніі Ул. Вепрык, Ф. Таран, салісты Тэатра оперы і балета В. Ганчарэнка і В. Чарнабаеў. Аркестр выканаў творы беларускіх кампазітараў.

Лекцыі-канцэрты з вялікім поспехам прайшлі ў Крупках, Уздзе, Барысаве, Заслаўі, Івянцы.

У ГАСЦЯХ У МІНЧАН — ЭРМІТАЖ

Мінскае гарадское аддзяленне таварыства «Веды» арганізавала цыкл лекцый «У нас у гасцях Эрмітаж». У Доме палітасветы ўжо адбылася першая лекцыя — «Эрмітаж, яго мінулае і сучаснае».

Усяго ў плане — 17 лекцый. Слухачы пазнаёмяцца з мастацкімі помнікамі Егіпта і са старажытным мастацтвам Амерыкі, са скульптурай старажытнай Грэцыі, з творамі выдатных майстроў італьянскага Адраджэння, з палотнамі Рубенса і Рэмбранта, Веласкеса і Гоі... Лекцыі чытаюць высокакваліфікаваныя мастацтвазнаўцы, — навуковыя супрацоўнікі Эрмітажа.

Работнікі Эрмітажа выступяць таксама ў Мінскім педагагічным інстытуце, у Доме культуры аўтамабільнага завода, на электратэхнічным заводзе, у БДУ імя Ул. І. Леніна.

С. ЦІХОНЧЫК.

ГОРАД, У ЯКІМ МЫ ЖЫВЁМ

На такую тэму праведзен вечар у Тураўскім Доме культуры. Яго арганізавала мясцовая бібліятэка. На вечары прысутнічала звыш 400 рабочых маслазавода, харчовага камбіната, калгаснікаў калгаса «Новае жыццё», прадстаўнікоў інтэлігенцыі.

Аб гісторыі старажытнага Турава на вечары расказаў дырэктар мясцовага краязнаўчага музея П. Шчакатовіч. Цёпла сустрэлі прысутныя выступленні перадавікоў вытворчасці — брыгадзіра трактарнай брыгады калгаса «Новае жыццё» Героя Сацыялістычнай Працы Н. Рудзянкі, свінаркі гэтага ж калгаса, дэпутата Вярхоўнага Савета БССР Н. Радыёнавай, заслужанай настаўніцы рэспублікі Е. Воранавай, якія расказалі аб сваёй працы. Ваенком Жыткавіцкага раёна В. Каляднікаў расказаў аб барацьбе жыхароў Тураўшчыны за перамогу над ворагам на франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў тыле, на часова акупіраванай тэрыторыі.

У фае клуба быў афармлен стэнд з фатаграфіямі земляко́ў, якія асабліва вызначыліся на франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў тыле ворага.

«БЕЛТА»

ПЕРШЫ КАНЦЭРТ

Мінская абласная народная філармонія пачала канцэртны сезон. У зале Белдзяржфілармоніі адбыўся канцэрт народнага сімфанічнага аркестра Палаца культуры Белсаўпрофа і народнай харавой капэлы. З прывітаннем да самадзейных артыстаў звярнуўся народны артыст СССР Р. Шырма.

У канцэрце прагучала кантата Ю. Семяякі «Горад юнацтва», «Нясканчаная сімфонія» Ф. Шуберта, «Вальс фантазія» М. Глінкі, «Персідскі марш» І. Штрауса, вальс да драмы Лермантава «Маскарад» А. Хачатурана. У суправаджэнні народнага сімфанічнага аркестра інжынер К. Лутковская выканала арыю Віялеты з оперы «Травіята» Д. Вердзі.

Канцэрт самадзейных артыстаў прайшоў з вялікім поспехам.

□ □

На здымку — выступае народны сімфанічны аркестр Палаца культуры Белсаўпрофа.

НА ПРЭМІІ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ І ІМЯ ЯКУБА КОЛАСА

ПРАЦЯГ РУКІ

У спісе прэтэндэнтаў на рэспубліканскія літаратурныя прэміі імя нашых народных песняроў стаіць сёлета і зборнік вершаў Петруся Макаля «Круглы стол», зборнік, які заслужана заняў месца сярод лепшых паэтычных кніг мінулага літаратурнага года. Пра яго ўжо многа гаварылася і крытыкамі, і чытачамі — і з усіх друкаваных і вусных выступленняў выведзена ўжо «агульная» высокая ацэнка кніжкі. Але мне хочацца сёння яшчэ раз зярнуцца да «Круглага стала» і яшчэ раз паспрабаваць вызначыць галоўныя прычыны яго поспеху...

Па старой звычцы некаторыя літаратурныя крытыкі і кіраўнікі ўсё яшчэ залічаюць Петруся Макаля ў шматлікі і стракаты гурт маладых. А ён і гадамі, і сваёй творчасцю даўно вырас з гэтага ярлыка. І найлепшае сведчанне таго—яго апошняя кніжка.

«Круглы стол» — кніжка сталая. І ў сэнсе грамадзянскай сталасці аўтара, і ў сэнсе яго прафесіянальнага майстэрства. У зборніку неспакойна б'ецца разважлівы і глыбокі роздум чалавека дваццатага нялёгкага стагоддзя; у зборніку часта звініць паслухмянае паэту важкае слова. Добрым адзінствам зместу і формы — калі гаварыць прывычнымі школьнымі фармуліроўкамі — вызначаюцца ўсе лепшыя вершы «Круглага стала». Таму адкрытая публіцыстычнасць іх не зрываецца на рыторыку, а яркая вобразнасць — на дэманстрацыю ўмельства.

Галоўная вартасць кніжкі Макаля, на маю думку, — у яе значнасці і сучаснасці. Прычым прыкметы сучаснасці тут не знешнія (высакавольтныя лініі, камбайны, межпланетныя трасы), а глыбока ўнутраныя. Душа чалавека сённяшняга дня, яго трывогі і турботы—вось што часцей за ўсё характарызуе ў паэта тую неверагодна складаную гаму падзей нашага часу, на якую мы так часта спасылаемся і якую так нялёгка перанесці ў мастацкі твор. Невыпадкова таму адным з самых «актуальных» вершаў Макаля стаў верш «Сустрэча з Бахам», верш пра сувязь стагоддзяў, пра няспынную і крывавую вайну людзей з несправядлівасцю на зямлі, пра чысціню і глыбіню пачуццяў, пра сталенне чалавечай душы і думкі. Адказнасць за ўсё на свеце, якая так характэрна для нашага часу, — гэта не лозунг твора, а яго сутнасць.

Унутранай злабадзённасцю хвалюе і «Сікейрас» — верш пра адказнасць мастака перад народам і гісторыяй, пра тое, што

Астрожнымі бразгаць брамамі
Піратам і імператарам,
Пакуль на зямлі не абрана
Праўда адзіным дыктатарам.

Акцэнтуючы ўвагу на вострай злабадзённасці гэтых вершаў, я тым не менш веру ў іх даўгавечнасць, бо актуальнасць іх не аднадзённая і выкліканы яны вельмі важнымі праблемамі веку.

У «Круглым стале» аўтар нагул падкрэслена звязвае свае творы з пэўным часам, з празаічнай будзённасцю, а гэта заўсёды тоіць у сабе небяспеку збіцца на драбнатэм'е, на непатрэбнае калекцыянраванне бытавых падрабязнасцей. Варта не ўтрымацца на «залатой» і такой няпэўнай сярэдзіне — і не памогуць ужо ні гукапіс, ні бліскавіцы асацыяцый... Макаль, на мой погляд, даволі ўдала пазбягае небяспекі, застаючыся гранічна канкрэтным і не губляючы шырыні погляду на свет. Нават у такіх, адкрыта «бытавых» вершах, як «Жалезны Адам», «Салат «Сямейная ідылія», праглядвае выказаная з незласлівай усмешкай і сялянскай хітрынкай думка аб складанасці і супярэчнасці нашага зямнога быцця...

Хочацца адзначыць і яшчэ адну прыемную рысу зборніка «Круглы стол» — яго інтэлектуальнасць. Яна, безумоўна, не ў тым, што П. Макаль даволі часта і свабодна аперыруе імёнамі Бетховена, Баха, Шэкспіра, Гамера, Галілея. Яна ў тым, што паэт стараецца ў кожным вершы думаць, аналізаваць, стараецца асэнсоўваць кожную драбніцу жыцця. Імкненне да роздуму заўсёды прываблівае, а калі яшчэ бачыш і ўменне мысліць шырока і паэтычна, дык, я думаю, ёсць падставы радавацца. І я парадаваўся, сустрэўшыся ў зборніку П. Макаля з вершамі «Адбітак пальцаў», «Ля абеліска Перамогі», «У лесе», «Сікейрас», «Сустрэча з Бахам». Парадавала мяне імкненне паэта быць не рэгістратарам падзей і думак, а «кандэнсатарам» іх.

Немалаважна, на мой погляд, і тое, што за круглым сталом паэта сабраліся пераважна працаўнікі. П. Макаль на поўны голас услаўляе працу, зямную, нялёгкую, неабходную, працу як сродак жыцця, працу як радасць. Чароўнае мастацтва бачыць ён у працы шаўцоў («Абутнікі»), подзвіг касманаўтаў вымярае працай аратага («Нашы хлопцы»). І недарэмна адзін з лепшых вершаў кніжкі — пра пчол:

Паклонам першым і паклонам
сотым,
П'янеючы без хмелю пакрысе,
Я кланяцца гатоў пчаліным
сотам,
Мядовай іх спакуслівай красе.
Не літасцю багоў падараваная,
Турботай і работай —
вось яна,
Уся з маленькіх сотаў
змураваная
Майстрамі пералётнымі сцяна.
Пабліскваe бурштынавымі
блёсткамі
Праменны мур
пчалінае радні,
Якая мёд з калодзежаў
пялёсткавых,
Нібыта з шахтаў,
Цягне дзень пры дні.
Спякоты спадароянніца
бухматая,
Нястомная шукальніца-пчала...
Дык гэта ж ёй сама прырода-
матухна
Усё сваё шчасце аддала!
Запоўняць сонцам соты, нібы
літары,
Працавікі пагоднаю парой,
А там і трутняў
з дому дружна вытураць:
За гэта —
ўвесь пчаліны рой —
гарой!

Паэт і да сваіх вершаў ставіцца, як працаўнік, вымяраючы іх вартасць не гучнай славай, не знешняй прывабнасцю іх, а ўнутранай сутнасцю іх, іх «байцоўскімі» якасцямі. Сцвярджаючы права чалавека на радасць, на мір, на працу, ён патрабуе актыўнасці і смеласці. Стварацъ! — галоўны закон на зямлі. І, як стваральнік, аўтар піша:

Мае радкі —
не лесвіца ў вяхі,
Што недзе за туманнай рысай
неба.
Мае радкі —
працяг маёй рукі,
Якой мне столькі рук
паціснуць трэба!..

Вось на гэтым я і хачу закончыць сваё слова ў абмеркаванні кніг, вылучаных на атрыманне літаратурных рэспубліканскіх прэмій.

Магчыма, скажуць, што ў маёй ацэнцы зборніка П. Макаля не хапае грунтоўнасці і ўсебаковасці. Можа быць. Бо я не пісаў рэцэнзіі... Магчыма, скажуць, што я ў сваім выступленні прадузяты. Можа быць. Бо я лічу, што кніжка паэзіі «Круглы стол» варта прэміі імя Янкі Купалы.

Генадзь БУРАЎКІН.

ЯШЧЭ АДНА СУСТРЭЧА

З любімым пісьменнікам сустракаешся часта — кожны раз, калі бярэш у рукі яго кнігі, перачытваеш такія знаёмыя і дарагія для цябе старонкі.

Народнага нашага песняра, незабыўнага Якуба Коласа я даўно лічу сваім настаўнікам і дарадчыкам. Я чытаю і перачытваю яго цудоўныя паэмы і вершы, разам з ім смяюся і радуюся—і часта не магу нават стрымаць слязу. Сустрэчы з яго выдатнымі творамі сталі для мяне душэўнай патрэбай.

І вось — яшчэ адна сустрэча з выдатным пісьменнікам, на гэты раз у кнізе Максіма Лужаніна «Колас расказвае пра сябе». Я быў вельмі рады, калі, як кажуць, з першых вуснаў пачуў, які чалавечны, мудры і просты быў дзядзька Якуб. Па творах я ўяўляў яго такім. І як хораша было пераканацца, што не памыліўся...

Са старонак кнігі М. Лужаніна наш слаўны паэт паўстае як сын народа, які зразумеў народную душу і здолеў расказаць аб яе глыбіні і багацці шчыра і пранікнёна. Як жывы, паўстае перада мной Кастусёк, які гоніць пасвіць каровы і заслухоўваецца салаўінай песняй, Кастусь, які ўключаецца ў барацьбу за шчасце народнае, Канстанцін Міхайлавіч, якога акружаюць сябры і паплечнікі — беларускія пісьменнікі. Аўтар вельмі добра расказвае пра нялёгкую працу літаратара, пра тое, як нараджаліся выдатныя творы Коласа. А як хораша апісана, калі «дзядзька Якуб» тупае па лесе, шукаючы грыбы! Як трапна перададзена мова народнага паэта, такая санавітая і выразная!..

Я вельмі ўдзячны М. Лужаніну, што ён мне наладзіў такую цікавую і цёплую сустрэчу з Коласам, і думаю, што яго кніга варта высокай адзнакі нашай грамадскасці.

І. СІУЧАНКА.

г. п. Нароўля.



У чытальнай зале Мазырскай цэнтральнай бібліятэкі імя Пушкіна заўсёды многа наведвальнікаў. Тут можна сустрэць і рабочага, і інжынера, і школьніка, і студэнта. Карыстаецца ж паслугамі бібліятэкі больш як чатыры з палавінай тысячы чалавек.

Фота нашага чытача Ул. ТУРАЎЦА (Мазыр).

КРАЯЗНАЎЧЫЯ КУТКІ Ў ШКОЛАХ

...Невялічкі пакой у сярэдняй школе калгаса «Рассвет» Кіраўскага раёна. На сценах — шмат фотаздымкаў. Адны з іх расказваюць пра гісторыю першай школы ў калгасе, другія — пра настаўнікаў, якія былі вучнямі гэтай школы, трэція прысвечаны жыццю сялян роднай вёскі. А вось стэнды. На іх экспануюцца старадаўнія манеты, прылады каменнага веку, знойдзеныя на тэрыторыі калгаса.

Так адзін са школьных пакояў стаў краязнаўчым кутком, які штодзённа наведваюць не толькі калгаснікі, але і ўсе тыя, хто прыязджае ў калгас па справах. Куток дапамаглі арганізаваць работнікі Бабруйскага краязнаўчага музея.

Падобныя краязнаўчыя куткі створаны ў дваццаці школах Бабруйска. Вучні з дапамогаю музейных работнікаў выяўляюць цікавыя дакументы аб мінулым горада, аб героях грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, аб развіцці прамысловасці і культуры Бабруйска. Школьнікі робяць цікавыя альбомы, экспазіцыі, выстаўкі.

Хутка краязнаўчыя куткі з'явяцца яшчэ ў дзесяці школах горада.

«МАЛАДОСЦЬ» 1966 ГОДА

Апошні, дванаццаты нумар часопіса «Маладосць» падрыхтаваны да друку і здадзены ў вытворчасць. Наш літаратурны год, такім чынам, закончаны.

Сёлета часопіс пазнаёміў сваіх чытачоў з шэрагам цікавых празаічных і паэтычных твораў як старэйшых пісьменнікаў рэспублікі, так і маладзейшых. Разнастайны па змесце і тэматыцы быў публіцыстычны раздзел, многія артыкулы, карэспандэнцыі, публікацыі выклікалі жывы водгук чытачоў. Усё гэта дапамагло замацаваць дружбу з падпісчыкамі: з месяца ў месяц тыраж рос, а не падаў, як у мінулыя гады. Гэта радуе і акрыляе. Рэдакцыйны калектыў намагаецца зрабіць часопіс яшчэ больш прывабным з выгляду, яшчэ больш цікавым і змястоўным.

Мастакі распрацавалі новае афармленне «Маладосці» на 1966 год. Яно будзе больш лёгкім, выразным, успрымальным на вока і больш сучасным. Спадзяёмся, што яно спадабаецца чытачу.

Галоўны клопат у рэдакцыі аб асноўным раздзеле часопіса — мастацкай прозе і паэзіі. Вакол «Маладосці» групуецца і актыўна супрацоўнічае ў ёй вялікі атрад таленавітай моладзі. Лепшыя творы маладых — апавяданні, аповесці, вершы — мы будзем друкаваць у наступным годзе. Галоўнае, на што мы звяртаем увагу,— высокая якасць твора і тэматыка, якая павінна адпавядаць узроставаму «цэнзу» нашага асноўнага чытача — хлопцаў і дзяўчат. Аб моладзі, вядома, пішуць не толькі маладыя, але і старэйшыя пісьменнікі.

Новы літаратурны год «Маладосць» пачынае аповесцю Алеся Адамовіча «Вікторыя». Аўтар вядомай дылогіі «Партызаны» на гэты раз расказвае пра сённяшнія дні, пра маладую дзяўчыну Вікторыю, яе цяжкі шлях па жыццю.

Перадаў часопісу сваю новую аповесць Іван Шамякін, аўтар востраскюжэтных твораў. Аповесць «Ах, Міхаліна, Міхаліна» ставіць перад чытачом даўнюю, але вечна маладую праблему кахання. Як вырашае яе аўтар, скажуць чытачы, але, напэўна, твор выкліча ў асяроддзі моладзі нямала спрэчак.

Добрым, мяккім лірызмам прасякнута аповесць Алены Васілевіч «Мая ідылія». І хоць твор гэты пра далёкія ўжо гады, ён чымсьці надзвычай сучасны і блізкі нашым хлапчукам і дзяўчатам, што толькі ўступаюць у жыццё.

Крыху незвычайнай па тэматыцы будзе аповесць Міколы Мірашнічэнкі «Малінавы звон». Аўтар пад выглядам «странніка» пабываў у манастыры, у семінарыі і пра ўсё, што там бачыў, расказвае або з гумарам, або з бязлітасным сарказмам, выкрываючы «боскіх служак».

Малады празаік Валянцін Мыслявец падрыхтаваў аповесць «Сакавік — месяц вясельны». Увагу аўтара прыцягвае праца і жыццё рабочай моладзі.

Ёсць у нашым партфелі і творы на навукова-фантастычныя тэмы. Вядомы савецкі пісьменнік-фантаст Аляксандр Казанцаў перадаў часопісу новую аповесць, галоўныя дзеючыя асобы якой — двое маладых людзей, якія збіраюцца ў доўгае падарожжа па сусвету.

Будзем мы друкаваць і другую кнігу рамана Івана Навуменкі «Сасна пры дарозе». Апрача таго, новыя свае творы абяцаюць рэдакцыі Янка Брыль, Барыс Сачанка, Іван Пташнікаў, Іван Чыгрынаў, Вячаслаў Адамчык, Міхась Стральцоў.

Багатым і разнастайным абяцае быць раздзел паэзіі. У першым нумары мы друкуем вершы Аркадзя Куляшова. Варта адзначыць, што часопіс у кожным нумары будзе змяшчаць невялікімі падборкамі вершы пяці-шасці паэтаў. Гэта зробіць паэтычны раздзел больш жывым, цікавым.

Шмат увагі, як і раней, часопіс будзе аддаваць публіцыстыцы. Побач з нарысамі, фотарэпартажамі аб жыцці, працы, адпачынку моладзі ў кожным нумары чытач знойдзе разнастайныя матэрыялы і аб адкрыццях сучаснай навукі, і аб цікавых загадкавых з'явах прыроды, і аб звычаях розных народаў.

Рэдакцыя падрыхтавала шэраг матэрыялаў, у якіх грунтоўна расказваецца аб гераізме нашай моладзі, аб баявых яе традыцыях, аб мужнасці і адданасці справе камунізма. Гэтыя артыкулы і нарысы дапамогуць камсамольскаму актыву паглыбляць выхаваўчую работу, а маладым людзям вучыцца жыццю на прыкладах са слаўнай гісторыі барацьбы савецкага народа за перамогу сацыялізма.

Больш увагі будзе аддадзена спорту. Як заўсёды, наш аддзел «Шахматы» будзе весці Аляксей Суэцін, «Шашкі» — Макс Шавель. Аматары гэтых відаў спорту знойдуць тут шмат карыснага для сябе.

Рэцэнзіі на кнігі, крытычныя артыкулы, публікацыі, кароткія заметкі, фотанарысы, гумарэскі — хіба пералічаш усе тыя творы, якія чытач знойдзе ў нашым часопісе...

Мы спадзяёмся, што кожны нумар «Маладосці» будзе з прыемнасцю чытацца.

Алесь АСІПЕНКА,
нам. галоўнага рэдактара часопіса «Маладосць».

Георгій ЮРЧАНКА

Літаратурныя пародыі

Я ПАЕХАЎ

(Адам РУСАК)

Умыты палеткі
Расою на Яна.
Устану па кветкі
Я рана-зарана.

Прыпеў:

На грэблі дубовай
Дарога заўецца.
Мне трыццаць гадоў
Адно й тое ж пяецца.
Ой, ой,
Адно й тое ж пяецца.

Паеду ля гаю,
Ля гонкай сасонкі,
А вам пажадаю
Згаворлівай жонкі.

Згаворлівай жонкі,
Ласкавай суседкі,
Прыемнай гамонкі
І ўзімку, і ўлетку.

Прыпеў.

Жадаю вам статак
Кароў і авечак,
Табунчык цялятак
І кучку ячак.

Праеду ціхутка
Я брод пад гарою.
Паеду на суткі,
А можа на двое.

Прыпеў.

РАБІНЫ

(Міхась КАЛАЧЫНСКІ)

Я слухаў,
Як гусі трубілі,
Грымела вясны гамана.
І думаў аб гронцы рабіны.

Пісаў я, як гусі трубілі,
Грымела вясны гамана,
А думкі аб гронцы рабіны
Скраблі ад цямна да цямна.

Прыедзьце ж, сябры, з Украіны,
З Тракая, з Байкала, з Сулы,—
Я ўстаўлю настойкай з рабіны
Уласнай работы сталы.

А потым паедзем па Піне,
Па Нёману, Сожу, Дняпры, —
Вы ўбачыце: гронкі рабіны
Гараць, нібы кроплі зары.

Мне болей не ведаць супыну,
Навекі заказан спачын, —
Рабіна,
рабінай —
рабіну,
Рабіны!
Рабінам —
рабін!..

ПРА ТЫЯ ДНІ

Не так даўно я быў у сваёй роднай вёсцы. Сустрэў аднаго знаёмага, заўзятага кнігалюба, пытаю:

— Што новага прачытаў?

— Тое-сёе прачытаў, — адказаў мой знаёмы. — Пераважна пра вайну. Я люблю такія кнігі.

— А што іменна?

— Новы зборнік Васіля Быкава. І яшчэ «Пушчанскую адысею» Карпюка. Не ведаеш, гэта аўтабіяграфічная аповесць? Пісьменнік расказвае так жыва і пераканаўча, як быццам сам усё гэта перажыў. Відаць, так яно і ёсць...

Гэтую размову я ўспомніў, калі ўбачыў прозвішча Аляксея Карпюка ў спісе пісьменнікаў, чые творы вылучаны на атрыманне рэспубліканскіх літаратурных прэмій імя Я. Купалы і імя Я. Коласа. І мне захацелася гэтую размову прадоўжыць на старонках газеты, падаць і свой чытальніцкі голас «за».

Як і майму знаёмаму, мне таксама спадабалася кніга Аляксея Карпюка «Пушчанская адысея». І спадабаўся мне перш за ўсё яе галоўны герой Кучынскі.

З Кучынскім мы знаёмімся з першых старонак аповесці. Ён за кратамі фашысцкага лагера Штутгоф. Спачатку як быццам нічым асаблівым сярод іншых зняволеных не вылучаецца: ціхі вясковы хлопец. Нават, здаецца, звыкся з лагерным жыццём, са сваім лёсам. «Хто-о? Гэта ён уцячэ-э?» — думаюць пра яго немцы. Але гэта толькі знешне такі Аляксей Кучынскі. На самай справе хлопец гарыць жаданнем вырвацца на волю. І ён дасягае свайго, уцякае. Першае выпрабаванне вытрымана. Потым пачнуцца іншыя — і недавер да яго, як былога зняволенага ў партызанскім атрадзе, і смерць таварышаў, і трывога за маці і бацьку, якія таксама ўключаюцца ў барацьбу супраць ворага...

Словам, Кучынскаму даводзіцца нялёгка. Асабліва, калі ўлічыць тое, што ён яшчэ зусім малады, з малым жыццёвым вопытам чалавек. І тым не менш ён не пасуе перад цяжкасцямі, займае сваё месца ў радах народных мсціўцаў і становіцца камандзірам партызанскага атрада...

З такіх людзей, як Кучынскі, хочацца браць прыклад. Яны вучаць нас мужнасці, самаахвярнасці, любві да Радзімы, яны вучаць нас жыць і змагацца.

Ёсць у аповесці і іншыя героі, якія запамінаюцца, — бацька Кучынскага, яго баявыя сябры.

А. Карпюк адкрывае кнігу словамі: «Маім баявым сябрам — былым байцам і камандзірам партызанскага атрада імя Кастуся Каліноўскага». Аповесць — своеасаблівы помнік народным мсціўцам, дакладней—адзін са шматлікіх помнікаў тым трудным, гераічным дням, калі ішло змаганне «ради жизни на земле». І таму, я лічу, яна варта літаратурнай прэміі імя Якуба Коласа.

А. МАРЦІНОВІЧ,
студэнт БДУ імя Ул. І. Леніна.

Выйшлі з друку

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»

Э. Самуйлёнак. Будучыня. Раман. На рускай мове. Пераклад з беларускай мовы С. Родава. Прадмова В. Вольскага. Мастак С. Спіцын. 1965 г. Тыраж 75 тыс. экз., 440 стар. Цана 79 кап.

Л. Гаўрылкін. Прашу звольніць мяне. Аповесці. Мастак І. Немагай. 1965 г. Тыраж 7 тыс. экз., 232 стар. Цана 38 кап.

А. Астрэйка. Сэрца насцеж. Вершы. Мастак М. Бялецкі. 1965 г. Тыраж 5 тыс. экз., 136 стар. Цана 29 кап.

В. Адамчык. Міг бліскавіцы. Апавяданні. Мастак В. Шаранговіч. 1965 г. Тыраж 5 тыс. экз., 152 стар. Цана 23 кап.

Р. Бярозкін. Свет Купалы. Думні і назіранні. 1965 г. Тыраж 3 900 экз., 304 стар. Цана 62 кап.

А. Пальчэўскі. Данеўцы — нашы знаёмыя. Аповесць. Для сярэдняга ўзросту. Мастак В. Ягораў. 1965 г. Тыраж 7 тыс. экз., 124 стар. Цана 25 кап.

В. Хомчанка. Верны рыцар. Апавяданні. Для сярэдняга ўзросту. 1965 г. Тыраж 7 тыс. экз., 172 стар. Цана 30 кап.

Хольгер Пук. Як зробіш ты? Апавяданне. Пераклад з эстонскай М. Гурына. Для сярэдняга і старэйшага ўзросту. Малюнкі Ю. Пучынскага. Вокладка і тытул Ю. Сандгазіна. Тыраж 5 800 экз., 120 стар. Цана 11 кап.

Н. Пашкевіч. На шырокіх шляхах жыцця. Літаратурна-крытычныя артыкулы. Мастак Г. Кісель. 1965 г. Тыраж 2 800 экз., 400 стар. Цана 65 кап.

М. Малочка. Жыў-быў хлапчук. З дзённікаў і пісем. Мастак І. Немагай. Прадмова С. Нараўчатава. 1965 г. Тыраж 11 600 экз., 156 стар. Цана 18 кап.

Я. Пасаў. Чалавек за бортам. П'еса ў трох дзеях, васьмі карцінах. Мастак Я. Зайцаў. 1965 г. Тыраж 2 700 экз., 140 стар. Цана 17 кап.

Д. Смірноў. Запіскі чэкіста. На рускай мове. Літаратурная апрацоўка А. Міронава. Мастак А. Кашкурэвіч. 1965 г Тыраж 75 тыс. экз., 256 стар. Цана 44 кап.

Д. Сасеў. Першы гром. Вершы. Для малодшага ўзросту. Мастак Ул. Басалыга. 1965 г. Тыраж 3 700 экз., 32 стар. Цана 6 кап.

Рыгор Рэлес

АДА КОЛЧЫНА

Я працую настаўнікам у школе рабочай моладзі. У выніку шматгадовых назіранняў напісаў кнігу апавяданняў «За цеснымі партамі». Прапаную ўвазе чытачоў «Літаратуры і мастацтва» некалькі старонак з гэтай кнігі.

Аўтар.

Кастусь Іванавіч неўзлюбіў выкладчыцу гісторыі Лолу Сяргееўну з першага дня яе прыходу ў школу. Спачатку ён не ведаў, чаму яна яму так не спадабалася. Ён пачаў сябе пераконваць, што яго непрыязнасць да настаўніцы беспадстаўная, і стараўся быць больш ветлівым да яе. Лічыў, што гэтым ён перамагае ў сабе супярэчлівыя пачуцці. Потым упэўніўся, што чущё яго не падманула.

Аб'ектам іх спрэчак была вучаніца Ада Колчына. Лола Сяргееўна вельмі не любіла гэтую дзяўчыну, якая хоць і была гадоў на восем старэйшая за Носіка, Аўгусціну, паказвала ім дрэнны прыклад. Ада прапускала заняткі, уцякала з урокаў. У школу яна прыходзіла абавязкова модна апранутая. Лола Сяргееўна запэўнівала, што нельга, каб такая фіфа сядзела разам з падлеткамі.

Ада зусім не даражыла школай, хадзіла толькі таму, што ў магазіне, дзе яна працавала касірам, патрабавалі, каб вучылася.

У час урокаў часта адчыняліся дзверы і паказваўся цыбаты хлопец з чорнымі бакенбардамі.

— Дазвольце выйсці,—прасіла Колчына, убачыўшы яго. І да канца ўрока яна ўжо не з'яўлялася. А на перапынку хуценька збірала кнігі і ішла з тым бамбізам.

Аднойчы, калі ўрок вяла Лола Сяргееўна, цыбаты адчыніў дзверы класа.

— Колчына, я вам не дазваляю выходзіць, — сказала Лола Сяргееўна.

Але Ада не паслухала.

— Трэба з гэтым скончыць,—заявіла Лола Сяргееўна ў настаўніцкім пакоі.—Колчына такая нахабная, што далей нельга.

На наступны вечар Кастусь Іванавіч адшукаў Аду ў калідоры і, зрабіўшы сур'ёзны выгляд, сказаў:

— Калі зноў пойдзеце з урокаў, выключым.

— Ну, дапусцім, гэта не ў вашым характары,—адказала яна. — Я не веру, што вы можаце так строга са мной абысціся.

Ён даўно заўважыў, што яна размаўляе з ім, як з роўным.

— Паўтараю, я вымушаны буду...

— Ну, гэта іншая справа. У такім выпадку дзякую, што папярэдзіў.

З ёю было лёгка гаварыць. Яна ўсё разумела з паўслова.

Нельга сказаць, што апошняе папярэджанне класнага кіраўніка прайшло бясследна. Колчына кожны даень хадзіла ў школу, цыбаты хлопец не паказваўся. Відаць, ёй усё ж не хацелася расставацца са школай. Але класнага кіраўніка непакоіла, ці здолее яна так трымацца да канца навучальнага года. Ці хопіць у яе сілы волі?

Ішоў дзень за днём, і Колчына паводзіла сябе ў школе нармальна. Яна нават пачала лепш вучыцца. Але Лола Сяргееўна на гэта ніколькі не зважала. Яна ўжо такая — калі каго няўзлюбіць, дык потым ніяк не можа змяніць свае адносіны.

У школе рыхтаваліся да вечара сустрэчы з выпускнікамі. Раздаючы білеты, Лола Сяргееўна папярэдзіла класнага кіраўніка:

— Можаце раздаць білеты ўсім сваім падапечным, за выключэннем Колчынай.

— Чаму? Чым яна горшая за іншых?

— Вельмі трэба, каб гэтая вульгарная стыляга сваім выглядам псавала ўсім настрой у зале. Прычым не выключана магчымасць, што следам за ёю да нас завітаюць і яе сябрукі.

— Тады самі раздавайце білеты майму класу,—адказаў Кастусь Іванавіч.

— Калі ласка.

Перад пачаткам апошняга ўрока Колчына падышла да класнага кіраўніка. Яна была вельмі ўсхваляваная.

— Вы падумайце, усім нашым далі білеты, толькі адной мне не хапіла.

— Відаць, не ўлічылі, што ў вас ёсць жаданне пабыць на вечары,—сказаў класны, — бо вы нашы вечары наведваеце рэдка.

— Мяне гэтым зняважылі,—сказала Колчына,—настрой сапсавалі. У гэтую нядзелю ў мяне якраз імяніны. Што і казаць, добры падарунчак.

— Ды не рабіце з гэтага трагедыі,—супакоіў яе класны кіраўнік. — Прыходзьце, і я вас правяду без білета.

— Няўжо асмеліцеся? У такім разе абавязкова прыйду, хоць бы для таго, каб праверыць вашу смеласць.

На вечары Ада вылучалася: толькі яна адна была ў чорнай бальнай сукенцы і ў чорных пальчатках.

Хлопцы-аднакласнікі з ёю не танцавалі. Адны, падлегкі, яе саромеліся, а другія недалюблівалі. Не сябравалі з ёю і аднакласніцы.

На вечары калі Ады ўвіхаўся вучань дзесятага класа Міхась Козыраў—таксама франтаваты хлопец. Ён увесь час танцаваў з ёю.

Лола Сяргееўна спачатку рабіла выгляд, што зусім не заўважае Колчынай. Але нарэшце ў яе не хапіла вытрымкі.

— Як гэта ўсё-такі зразумець?—здзекліва спытала яна ў Кастуся Іванавіча. — Вы мяне проста здзіўляеце.

— Разгадка простая, — спакойна адказаў Кастусь Іванавіч. — Калі Колчына асабіста вам не падабаецца, дык гэта яшчэ не значыць, што яна не такі чалавек, як усе.

— Яна тут нікому не падабаецца,—адказала Лола Сяргееўна. І дадала: — Акрамя, можа, вас. І ў такім выпадку вам трэба было быць больш асцярожным. Вы ж педагог.

Ах, вось куды яна гне!..

— А мне няма чаго ўтойваць.

— Тым горш для вас.

Лола Сяргееўна ўсё ж не была задаволена і лічыла, што яшчэ недастаткова адплаціла яму за тое, што ён насуперак ёй запрасіў Колчыну. Яна не адыходзіла і думала, чым бы яшчэ яму дапячы

Выпадак надарыўся. Яна заўважыла, што Колчына час ад часу кідае вачыма ў бок класнага настаўніка.

— Аднак вы няўважлівы кавалер,—з'едліва прамовіла яна,—на вас заглядваюцца, а вы не заўважаеце.

— Хацеў бы ведаць, хто?—спытаў ён з робленай цікавасцю.

— Не прыкідвайцеся наіўным, самі сказалі, што вам няма чаго ўтойваць.

І тут здарылася тое, чаго ён сам не чакаў. Ён падышоў да Колчынай і запрасіў яе на танец. А Лоле Сяргееўне толькі гэта і трэба было.

— Бачыце, што робіцца?—пераходзіла яна ўзрушаная ад аднаго настаўніка да другога. —Я ж казала.

Даўно не бачылі яе настаўнікі ў такім захапленні.

Наіўны Кастусь Іванавіч! Яму здавалася, што ён зробіць ёй непрыемнае, а атрымалася наадварот...

Заўсёды, калі ў яго быў кепскі настрой, ён ішоў дадому адзін. Так было і цяпер.

— Кастусь Іванавіч,—пачуўся ззаду голас Колчынай.

Вось табе і на! Толькі гэтага і не хапала!

— Звычайна я заўсёды еду, але ў такую цудоўную ноч не грэх і пеша прайсці,—залапатала яна, узяўшы Кастуся Іванавіча пад руку. — Вы, мусіць, таксама рашылі прагуляцца?

— Не, я на наступным прыпынку сяду на трамвай. Мяне чакаюць дома.

— Ну, гэта вы выдумляеце. Я ведаю, што вы жывяце адзін, і ў такі позні час вас няма каму чакаць. Але я вас разумею... І ўсё ж баяцца вам няма чаго. Можаце быць упэўнены, што нікога з вучняў мы не сустрэнем. А калі сустрэнем, таксама нічога страшнага. Мы ж жывыя людзі і амаль у адных гадах.

— Але я ваш настаўнік...

— Ну і што ж? Між іншым, у мяне з вамі дзелавая размова, калі хочаце ведаць. Вы ведаеце, што я сёння імяніннца?

— У такім разе віншую.

— Ха-ха-ха!—весела засмяялася яна. — Хто ж так віншуе? Але дзякую і за гэта! Хоць адзін чалавек мяне павіншаваў. А я старалася, на ўсялякі выпадак нават бутэлечку каньяку падрыхтавала. Відаць, так і застанецца нераспітая. Першы раз у жыцці так адзначаю свой дзень нараджэння.

— Хто ж у гэтым вінаваты?

— Вядома, вы.

Кастусь Іванавіч ведаў, што яна жыве адна, і таму ніколі дома ў яе не быў, хоць і абавязаны быў ведаць яе хатнія ўмовы.

— Па-мойму, я перад вамі ні ў чым не вінаваты.

— А ультыматум ваш помніце? Я вам абяцала, што больш не буду прапускаць заняткі і ніхто да мяне ў час урокаў не будзе прыходзіць. Вы думаеце, мне гэта так лёгка рабіць? З-за гэтага мне давялося з сім-тым расстацца. Увогуле, я засталася цяпер, як кажуць, ля разбітага карыта.

— Ну, нічога. Калі захочаце, дык і ў школе сяброў знойдзеце.

— Гледзячы якіх. І не так гэта проста. А ўвогуле ў класе я наўрад ці здружуся з кім...

Калі яны дайшлі да моста, Колчына раптам насцярожылася. Справа, каля скрыжавання, мільганула постаць. Кастусь Іванавіч пазнаў таго, цыбатага.

— Прабачце, мне трэба павярнуць направа,—сказала яна і, хуценька развітаўшыся, пакінула класнага кіраўніка.

«Нешта ў яе нядобра з гэтым хлопцам, — падумаў настаўнік, — але ж хіба яна скажа? Між іншым, і бацькі ў такіх выпадках бываюць бездапаможныя. Наогул дрэнна, што ў класе чамусьці махнулі на яе рукою».

Пасля ўсяго гэтага здарылася тое, чаго ён не чакаў. Колчына перастала хадзіць у школу. Ён пазваніў у магазін, дзе яна працавала. Адтуль паведамілі:

— Яна ляжыць у бальніцы, яе пабілі.

У настаўніцкім пакоі пра гэты выпадак гаварылі шэптам. І як толькі з'яўляўся Кастусь Іванавіч, размова адразу сціхала. І па тым, як Лола Сяргееўна кідала на яго цікаўны пагляд, ён разумеў, што яго лічаць вінаватым у тым, што здарылася.

Ён рашыў пайсці ў бальніцу, але яго калега Сцяпан Андрэевіч не параіў:

— Не рабіце гэтага. І так зашмат размоў. Лола Сяргееўна тут усім вушы пратрубіла, быццам гэты хуліган прыраўнаваў. Лепш пашліце да яе каго-небудзь з вучняў.

Кастусь Іванавіч усё ж пайшоў.

У палаце, дзе была Колчына, ён убачыў яшчэ дзвюх жанчын. Адна—старая, другая—маладзейшая. Старая глядзела на яго зняважліва, маладая—з цікаўнасцю.

Колчына ляжала. Галава яе была забінтавана. Убачыўшы яго, яна адвярнулася і заплакала.

Увайшла сястра:

— Ідзіце адсюль, няма чаго хваляваць яе.

— Ганіце яго, бессаромніка,—сказала старая.

— Вы мяне прынялі за некага другога, — апраўдваўся ён, разгублены. — Я з вячэрняй школы... настаўнік... прыйшоў праведаць...

— А, настаўнік, — палагаднела старая і тут жа напала на Колчыну:—Ты што? Да цябе чалавек прыйшоў!

Колчына яшчэ мацней заплакала. І тады сястра яму сказала:

— Усё роўна ідзіце. Другі раз прыйдзеце. Бачыце, у якім яна стане.

Кастусь Іванавіч падышоў да тумбачкі хворай, паклаў апельсіны і выйшаў.

— Што з ёю?—спытаў ён у сястры, якая праводзіла яго.

— Хуліган пабіў. Яе на вуліцы падабралі. У нядзелю вечарам.

У школе Лола Сяргееўна спытала ў яго:

— Чаго вы так напалохаліся? З твару змяніліся.

Ён не адказаў.

Потым прыйшоў следчы, і ўсё стала ясна:

— Гэты хуліган патрабаваў, каб Ада пакінула школу, а яна не згадзілася. За гэта ён яе пабіў...

— Вось бачыце,—выкручвалася Лола Сяргееўна, — я ж вам казала, што ўсё э-за класнага. Навошта было прымушаць яе вучыцца? Няхай кідае. І каб яна не была на вечары, то, можа, нічога і не здарылася б...

У школе вучні і настаўнікі адчувалі сябе перад Колчынай неяк няёмка.

І калі яна напярэдадні Кастрычніцкіх свят прыйшла ў школу, дык нават Лола Сяргееўна пачала мякчэй з ёю размаўляць і дала ёй білет на святочны вечар.

Пераклад з рускай мовы.

Дзяржаўны музей БССР збірае экспанаты і матэрыялы, якія расказваюць пра поспехі Беларускай рэспублікі, дасягнутыя за гады Савецкай улады. У фондах музея знаходзіцца дзесяцітысячны халадзільнік і першы рухавік Мінскага маторнага завода, узоры прадукцыі Магілёўскага завода штучнага валакна, Гродзенскага азотнатукавага камбіната, Салігорскага калійнага камбіната, макеты МАЗаў, БелАЗаў, долата бура, якім прабурылі першую прамысловую нафтавую шчыліну на Палессі і многа іншых экспанатаў.

На здымку — загадчык аддзела І. Загрышаў, старшы навуковы супрацоўнік А. Вінакураў і навуковы супрацоўнік аддзела фондаў музея В. Клімянкоў каля макетаў.

ТАЛАШКІНСКІЯ МАЙСТРЫ

У пятнаццаці кіламетрах ад Смаленска, ля вёскі Талашкіна, сярод пагоркаў, палёў і пералескаў, якія складаюць невыказную прыгажосць сярэднерускай прыроды, стаіць двухпавярховы зрублены дом, нібы перанесены сюды з казкі добрым чараўніком. І праўда — тамтэ церамы сустрэнеш толькі на ілюстрацыях да рускіх народных казак. Высокі канёк даху з узорыстымі разнымі ліштвамі, шматкаляровы роспіс фасада: тут і сонейка, якое ўсміхаецца, і цуда-коні з пушыстымі грывамі, і мудрагелістыя жар-птушкі, і залатыя рыбкі. Рэдкай мастацкай работы лесвіца на другі паверх, ганак. На такі ўзбягаў, напэўна, Іван-царэвіч. Словам — церам, сапраўдны церам, пра які расказваюць вечарамі бабулі сваім унукам перад сном. Зрэшты, гэты цудоўны твор мастацтва так і называецца «Церамок», а калі больш афіцыйна, дык — філіял Смаленскага краязнаўчага музея.

Але самае цікавае — нават не архітэктура і вонкавае ўбранства Церамка, а яго гісторыя, калекцыі, якія сабраны ў ім.

У сусветную гісторыю мастацтва ўвайшло падмаскоўнае Абрамцава — маёнтак Аксакавых, у якім збіраліся тыя, чые імёны склалі славу Расіі. Талашкіна можна смела назваць смаленскім Абрамцавым. І ў гэтым параўнанні не будзе ніякай нацяжкі. Тут, у былым маёнтку вядомай мецэнаткі княгіні Ценішавай часта бывалі І. Рэпін, В. Сяроў, М. Урубель, М. Рэрых, В. Паленаў, К. Каровін, В. Васняцоў, Ф. Шаляпін, А. Блок, Л. Андрэеў і іншыя выдатныя майстры пэндзаля, пяра, сцэны. І кожны ўносіў штосьці сваё ў сам дух гасцінная ценішаўскага дома.

Вядома ж, не без уплыву сваіх таленавітых сяброў Ценішава вырашыла заснаваць у Талашкіне музей рускага народнага прыкладнога мастацтва і мастацка-рамеснае вучылішча, дзе б маглі вучыцца здольныя і таленавітыя ў мастацкіх адносінах дзеці навакольных сёлаў. Для майстэрань гэтага вучылішча і быў пабудаваны Церамок па эскізах таленавітага мастака С. Малюціна, які кіраваў у той час талашкінскімі мастацкімі майстэрнямі.

У экспазіцыі сённяшняга Церамка — нямала работ выхаванцаў вучылішча: разьба па дрэве, мастацкі роспіс, вышыўка. І ўсё гэта ў выдатных і строгіх традыцыях народнай творчасці, усё ідзе карэннямі ў старажытную смаленскую зямлю.

Сярод выстаўленых работ вылучаюцца творы майстроў-настаўнікаў. Я трымаў у руках балалайку, распісаную самім Уоўбелем, бачыў мноства эскізаў і накідаў, зробленых рукою Рэрыха, сапраўдны старарускі вазок, упрыгожаны назачным роспісам Малюціна.

Буйнейшыя мастакі свайго часу, працуючы ў Талашкіне, ставілі сабе за мэту адрадзіць выдатныя традыцыі рускага народнага прыкладнога мастацтва, выхаваць ім вартую змену. І гэтая мэта была дасягнута. Слава аб талашкінскіх майстрах перайшла межы Смаленшчыны, а потым і Расіі. Ужо ў 1907 годзе калекцыі твораў народных майстроў пакінулі Церамок і накіраваліся ў далёкае падарожжа ў Парыж. На працягу некалькіх месяцаў яны дэманстраваліся ў чатырох залах Луўра. Як памяць аб гэтай падзеі ў Церамку захоўваецца пажоўклы ўжо каталог з незвычайным надпісам на тытульным лісце: «Талашкіна ў Луўры».

Па залах — не, гэта не тое слова — па святліцах Церамка мяне водзіць наглядчык музея Ксенія Кудраўцава, у мінулым настаўніца літаратуры, якая і сёння ў новай якасці выкарыстоўвае прафесіянальныя навыкі педагога і выхавацеля.

— Вось, звярніце ўвагу, гэта вельмі цікава, — гаворыць яна, запрашаючы да чаргова стэнда, шафы ці паліцы. І пачынае расказваць. Пра ўсё. І пра кераміку, сотні ўзораў якой захоўваюцца ў Церамку. І пра унікальныя калекцыі разной драўлянай мэблі. І пра даволі рэдкую калекцыю замкоў і ключоў. Пра старажытныя набіўныя і пернікавыя дошкі — першымі, акумуўшы ў фарбу, наносілі ўзор на тканіну, а другімі штампавалі славутыя рускія штампаваныя перніні з арнаментам, словамі і цэлымі сюжэтнымі карцінамі.

Падымаемся на другі паверх. У цэнтры прасторнай святліцы Кудраўцава спыняецца:

— Вось тут у вышывальшчыц прымалі работу...

Так і ўявілася строгае журы, яное прыдзірліва разглядала расшытыя ручнікі — ці няма заганы. Але мяркуючы па ўзорах, што развешаны на сценах, заганы былі не частай з'явай у талашкінскіх вышыўках. Дарэчы, і сёння на Смаленскім ільнокамбінаце, які карыстаецца вядомасцю ў Савецкім Саюзе і за рубяжом, адзін з самых папулярных малюнкаў для тканін называецца «Талашкінскія матывы». Дык вось — радзіма гэтага малюнка тут, у Церамку. Сённяшнія мастакі ільну творча выкарысталі цікавыя і арыгінальныя знаходкі талашкінскіх майстроў.

Калекцыі Церамка цікавыя яшчэ і тым, што яны не ўяўляюць сабою нешта закончанае, канчаткова, кананічна застыглае. Наадварот, яны развіваюцца, дапаўняюцца, растуць. І ўсё гэта таму, што жывуць і развіваюцца самі традыцыі рускага народнага прыкладнога мастацтва, таму, што не збяднела і ніколі не збяднее руская зямля яркімі народнымі талентамі, слаўнымі майстрамі-ўмельцамі. Ёсць і яшчэ адна прычына папаўнення калекцый. Смаляне вельмі любяць свой музей і прыносяць яму мноства цікавых знаходак, самых розных — і старых, і новых.

Вядомы савецкі мастак — акадэмік Ігар Грабар, пабываўшы ў Церамку, сказаў:

— У Талашкіна ёсць будучыня!

І гэта сапраўды так. Бо немагчыма абмежаваць сённяшняе значэнне сабраных тут скарбаў народнага мастацтва толькі рамкамі гістарычнага помніка. Талашкіна — гэта яшчэ і школа, гэта яшчэ і прыклад, гэта яшчэ і невычарпальная скарбонка мастацкага вопыту таленавітага рускага народа.

Кірыл БАРЫСАЎ.
(АДН).

ТАНЦУЮЦЬ УЛЬЧЫ

Калі зацікавіцца біяграфіяй прафесіянальных музычных калектываў, дык без цяжкасці высветліцца, што добрая палавіна з іх нараджалася спачатку як мастацкая самадзейнасць. Калі склады спіе акцёраў, што выйшлі з самадзейнасці, дык атрымаецца вялікі шматтомнік.

Давайце пазнаёмімся з адным з калектываў мастацкай самадзейнасці. Хабараўск. Дом народнай творчасці. К. Белабародава, навуковы супрацоўнік, расказвае пра танец ульчаў:

— Я ўпершыню ўбачыла яго два гады назад на канцэрце ў Хабараўску. І проста анямела ад захаплення. Дзяўчаты танцавалі, а гледачы бачылі павольныя хвалі велічнага Амура. Яны ўзнімаліся ледзь улоўна, зеленавата-пенныя хвалі, і над імі ў імклівым палёце неслася асляпляльна белая чайка... Уражанне было здзіўляючае.

Народныя танцы старажытнейшага племя ульчаў не могуць пакінуць раўнадушным: вось чаму спяшаюцца ў сяло Булаву людзі з навакольных паселішчаў, калі тут выступае танцавальны калектыў.

У Булаве вялікі клуб, але ён робіцца цесным і маленькім, калі на сцэне ідзе музычная легенда «Каханне каюра». Сюжэт яе, бадай, інтэрнацыянальны: бедны, але разумны і спрытны юнак перамагае ў імя кахання ўсе перашкоды. Ставячы «Каханне каюра», кіраўнік ансамбля Пётр Дзічулі паказаў казкі, песні, паданні, танцы ульчаў, даў ім новае сцэнічнае жыццё. Атрымаўся вельмі яркі паказ і па выкананню, і па афармленню: маляўнічыя касцюмы, фантастычная разнастайнасць вышыўкі на халатах. Гэтыя касцюмы зрабілі майстры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, аб'яднаныя пры клубе ў гурток.

АДН.

ЗАЛАТЫ МЕДАЛЬ — САВЕЦКАМУ ФІЛЬМУ

На Міжнародным фестывалі навукова-тэхнічных фільмаў, які закончыўся ў Бялградзе, савецкі кінафільм «У скафандры над планетай» атрымаў залаты медаль імя Ніколы Тэслы. У рашэнні журы адзначаецца, што фільм, зроблены з тэхнічнага пункту гледжання ў незвычайных умовах, з'яўляецца першым кінадакументам аб выхадзе чалавека ў касмічную прастору.

ТАСС.

ДАР БАЛГАРСКІХ СЯБРОЎ

Паўтара месяца ў Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя Ул. І. Леніна экспанавалася выстаўка балгарскай кнігі. Яе паказ пачаўся ў час Дэкады балгарскай культуры ў рэспубліцы.

Цяпер багатая калекцыя выданняў становіцца здабыткам бібліятэкі імя Ул. І. Леніна. Больш як тысяча кніг, што адлюстроўваюць поспехі балгарскай культуры, навукі, літаратуры, перададзены ёй у дар Усенародным камітэтам балгара-савецкай дружбы.

Дар балгарскіх сяброў з'явіцца каштоўным папаўненнем аддзела замежнай літаратуры бібліятэкі.

БЕЛТА.

У Львоў і Луцк

Улетку гэтага года ў Брэсцкай вобласці гасцілі работнікі музеяў Луцка і Львова. Яны пабывалі ў многіх музеях вобласці, пазнаёміліся з экспазіцыямі і фондамі. Госці запрасілі да сябе беларускіх сяброў. Днямі вялікая група музейных работнікаў Брэстчыны пабывала ў Луцку і Львове. Яны агледзелі ўстановы культуры, цікавіліся формамі і метадамі работы ўкраінскіх музеяў. Экскурсія была вельмі карыснай.

АДРАС МОДЫ — БУХАРЭСТ

Міжнародныя форумы моды—што гэта такое? На думку некаторых, проста эфектныя парады прыгажосці, элегантнасці, добрага густу. Тых, хто думае так, хацелася б запрасіць на адзін рабочы дзень VII пасяджэння пастаяннай рабочай групы па пытаннях культуры адзення пры Савеце эканамічнай узаемадапамогі. Такі афіцыйны тытул «Форуму моды». Сустрэча мастакоў і мадэльераў сямі сацыялістычных дзяржаў Еўропы адбылася ў Бухарэсце.

Сталіца народнай Румыніі прымала міжнародны «штаб моды» ўжо другі раз за гэты год. Цяпер працэс стварэння моды праходзіць у некалькі этапаў. Каб гарантаваць моду ад заўчаснага старэння, каб абнаўленне моды ішло больш плённа і без скачкоў, асартымент новых вырабаў вырашана планаваць на два гады наперад.

У Бухарэсце мода 1966 года зрабіла свае першыя крокі. Тут у пачатку гэтага года сустрэліся мастакі і каларысты, мадэльеры і тэкстыльшчыкі, каб разам абмеркаваць пытанні новай тэхналогіі, будучыню хімічных матэрыялаў, новую каляровую гаму, мэтазгоднасць і эстэтычныя вартасці новых сілуэтаў адзення і абутку. А потым пачаўся галоўны этап работы: апрабаванне моды будучага года ва ўмовах лабараторый, навукова-даследчых інстытутаў, на канвеерных патоках фабрык і камбінатаў. А нядаўна Бухарэст стаў зноў месцам сустрэчы стваральнікаў нашага адзення. Тут зацвердзілі адзіную модную калекцыю адзення 1966 года.

У дэманстрацыйнай зале зноў пстрыкалі затворы кінакамер і фотаапаратаў, мільгалі рознакаляровыя нацыянальныя сцяжкі ў руках юнакоў і дзяўчат, якія прадстаўляюць новую моду Балгарыі, Чэхаславакіі, ГДР, Румыніі, Польшчы, Венгрыі і Савецкага Саюза.

Гэта вельмі прыгожае відовішча не мела нічога агульнага з парадам. Клопат спецыялістаў, якія сабраліся тут, — стварэнне новых форм адзення для трохсот мільёнаў грамадзян сацыялістычных краін Еўропы. Імкненне стварыць разам новыя сілуэты і формы адзення не выклікае небяспекі «уніформы». Наадварот, адна галава—добра, а сем вялікіх творчых калектываў—лепш! Кожны ўзбагачае сучасны касцюм свежымі думкамі, пошукамі новых вырашэнняў, тэхналагічнымі навінамі.

Што ж прапанавалі на наступны год савецкія мастакі?

— Наш касцюм характарызуюць свабодныя, лёгкія, натуральныя формы, — расказала перад ад'ездам у Бухарэст Людміла Турчаноўская, галоўны мастацкі кіраўнік Агульнасаюзнага дома мадэлей адзення. — Яркі выражэнні рысы спартыўнасці ў адзенні кожнага дня.

У жаночым адзенні мастакі захавалі некалькі сілуэтаў паліто, сукенак, касцюмаў для задавальнення густаў моладзі і людзей пажылога ўзросту. Напрыклад, паліто. Жаночыну любога ўзросту ўпрыгожвае прамы «класічны» сілуэт, які прапануецца на ўсе сезоны наступнага года. Папулярнасцю будзе карыстацца паўпрыталены сілуэт, паліто тыпу рэдынгот, пашыранае ўнізе.

Не здзіўляючы навінамі ў сілуэтах, мода новымі цікавымі дэталямі падкрэслівае элегантны характар адзення наступнага года. Напрыклад, рукаў з трошкі павышаным акатам можа быць рознага крою: рэглан, ушыўны або цэльнакроены. Каўняры невялікія, адкладныя, трошкі падоўжаныя спераду, або стаячыя.

Кампазіцыйнай асновай сённяшняй моды застаецца падоўжаная плаўная гнуткая лінія. Стройнасць і натуральныя прапорцыі сілуэта падкрэсліваюцца не толькі кроем, але і размяшчэннем дэталей: вертыкальна прарэзанымі кішэнямі, каўнярамі-гальштукамі, доўгім вузкім рукавом з манжэтам на блузцы ці сукенцы.

Пры гранічнай прастаце ліній і канструкцый выразнасць нашага касцюма вызначае ў многім каляровая гама — яркая, сакавітая, жыццярадасная. У арсенале мастакоў — шэсць асноўных груп колераў: ад ружова-залацістых і чырванавата-аранжавых да чырванавата-карычневых. У летняй калекцыі прапануюцца новыя шэра-бежавыя і светла-зялёныя адценні.

Ювелірных упрыгожанняў амаль няма. Іх замяняюць модныя ў гэтым і наступных гадах штучныя кветкі, капронавыя і баваўняныя карункі.

Цікавую новую калекцыю адзення для мужчын прадставілі мастакі Масквы, Ленінграда і Прыбалтыкі. Мужчыны даўно перасталі ўжо лічыцца палоннікамі вузкага асартыменту і бляклых, сумных колераў. Але новыя мадэлі аднабортных і двухбортных паліто, арыгінальна афармленыя яркімі падкладкамі са штучнай футры або клятчатай шэрсці, касцюмы з тканін у вертыкальную палоску, лёгкія па сілуэту і лініях касцюмы без традыцыйных каўняроў і штрыфеляў, бясспрэчна, парадуюць многіх арыгінальнасцю і навізной.

Мода, як і думка мастакоў, ніколі не спыняецца на месцы. Ужо вызначыліся шляхі развіцця моды ў 1967 годзе, падвергліся абмеркаванню новыя тканіны і малюнкі трыкатажных палотнаў, новы каларыт, новае афармленне скураных вырабаў. Гэта — вынік працы соцень спецыялістаў.

Надзежда ЖАЛЯЗНОВА.
(АДН).

ДАХ-МАТЫЛЁК

Кіеўскі архітэктар Міхаіл Тупалеў прапанаваў арыгінальны праект крытага стадыёна, пялёсткавы дах якога, усеяны пражылкамі-тросамі, нагадвае матылька ў палёце. Іменна так — «матыльком» прафесар Тупалеў і называе неафіцыйна свой праект—канструкцыю з трох «сёдлаў». Канструкцыя «сядла», ужо вядомага архітэктуры, прадстаўляе з сябе дзве парабалічныя аркі, звязаныя сістэмай вантаў.

Спецыялісты сцвярджаюць, што рашэнне Тупалева яшчэ не сустракалася ў архітэктурнай практыцы. Сам аўтар гаворыць, што ідэю трылісніка яму падказала месца будаўніцтва стадыёна ў Кіеве. Стадыён мяркуецца пабудаваць на ўзгорку, вяршыня якога з'яўляецца трохвугольнай пляцоўкай. Ажурную сістэму тросаў, якія складаюць каркас даху, можна лёгка пакрыць плёначным матэрыялам, пластыкамі або лёгкім металам.

ТАСС.

АСЕННІ КЛЁЎ.

Фотаэцюд Ул. КАЗЛОВА.

НА ДНЕ ШТУЧНАГА МОРА

Некалькі гадоў назад весняныя патокі горнай ракі Ангрэн былі спіраваны ірыгатарамі Узбекістана ў гіганцкую натлавіну. Паблізу Ташкента вырасла штучнае мора. Вада захоўваецца тут усю зіму, вясну і ў час паліваў бавоўніку выпускаецца на палі. Тады мора да наступных паводак высыхае.

Сёлета, калі ўзровень вады ў Ташкенцкім моры знізіўся да мінімуму, баваўнаводы звярнулі ўвагу на тое, што на схілах аднаго з пабоўстраваў, які працягнуўся амаль на два кіламетры ў глыбіню вадасховішча, аказаліся размытыя вадою вялікія і малыя пагоркі. У іх знайшлі збаны для вады, хумы з рэшткамі збожжа, паўразбураныя архітэктурныя збудаванні, керамічныя печы і іншыя рэчы быту глыбокай старажытнасці. Выклікалі археолагаў. Яны адкрылі тут старажытнае паселенне, што прымыкае да гарадзішча Кендык-Тэпе. Найбольшую цікавасць уяўляе кераміка старажытных паселенцаў. Ручкі збаноў афармлены ў выглядзе фігурак барана са спіралепадобнымі рагамі. Многія збаны ўпрыгожаны досыць складанымі арнаментамі. Сустракаецца штампаваная кераміка. Знойдзена шмат сярэдневяковых манет.

Вада, якая запоўніла ложа штучнага вадасховішча, размыла спрадвечныя напластаванні глебы і з'явілася першаадкрывальнікам новага археалагічнага раёна ва Узбекістане, што адносіцца да перыядаў ранняга і позняга сярэдневякоўя.

АДН.

МУМІЯ З ПРАТЭЗАМ

Ва універсітэцкім музеі англійскага горада Дарэм захоўваецца егіпецкая мумія з пратэзам замест рукі. Узрост—2000 гадоў.

Нядаўна мумію дасталі з саркафага і аддзялілі ад яе пратэз. Пратэз будзе старанна даследаваны, бо невядома, ці карыстаўся ім старажытны егіпцянін пры жыцці, ці атрымаў яго пасля смерці ў час падрыхтоўкі «да жыцця на тым свеце».

Не выключана, што майстэрства пратэзіравання старажытных егіпцян можа аказацца карысным нават у нашы дні.

О. ПІВАВАРАЎ,
карэспандэнт ТАСС.

Наш міжнародны каментарый

Землі, якія знаходзяцца на ўсход ад граніцы ГДР з Польскай Народнай Рэспублікай — па рэках Одэру — Нейсе, бонскія рэваншысты вызначаюць як «нямецкія ўсходнія тэрыторыі, што знаходзяцца ў сучасны момант пад чужаземным кіраваннем».

З газет.

РЭВАНШЫСТ У ПАХОД САБРАЎСЯ.

Мал. Ул. БАРАНОЎСКАГА.

Іх норавы, іх мараль

Факты з зарубежных газет і часопісаў

Аддзел вядзе загадчык кафедры замежных моў Віцебскага медыцынскага інстытута Л. АБРАМЕНКА.

УСЕ РОЎНЫЯ

Нядаўна ў артылерыйскай школе Ідар-Оберштэйн (ФРГ) адбылася ўрачыстая цырымонія, прысвечаная рашэнню Ватыкана лічыць святую Варвару апякункай артылерыі. На цырымоніі прысутнічалі высокапастаўленыя афіцэры. Інспектар артылерыі Рота, былы маёр гітлераўскай арміі, выступіў з урачыстай прамовай, якую пачаў так: «Перад тварам апякункі артылерыі святой Варвары мы ўсе роўныя. Усе роўныя, нават радавыя артылерысты».

«Вохенпост».

ТЭОРЫЯ І ПРАКТЫКА

Два 12-гадовыя нью-йоркскія школьнікі, добрасумленна вывучаўшы нядаўна ўведзены ў школах курс банкаўскай справы, вырашылі прымяніць атрыманыя веды на практыцы. Запоўніўшы чэкавую кніжку і старанна падрабіўшы подпіс дырэктара школы, яны накіраваліся ў банк. Па трох чэках ім удалося атрымаць грошы, перш чым падробка была заўважана.

«Дэйлі ёркер».

САБАКА ХРЫСЦІЯНСКАЙ ВЕРЫ

Адзін з жыхароў англійскага горада Чобхэм, пахаваўшы свайго сабаку, пастаніў на яго магіле крыж з надпісам: «Тут ляжыць самы высакародны і верны з усіх сабак. На небе мы зноў сустрэнемся». Багамольныя суседзі зламалі і спалілі крыж, а святчэнік прыгразіў гаспадару адлучэннем ад царквы. Справа паступіла ў лонданскі суд, які ўстанавіў, што сабака можа быць хрысціянскага веравызнання, як і яго гаспадар, і таму крыж на яго магіле не з'яўляецца нечым недазволеным.

«Фольксштыме».

РЭПЕТЫЦЫЯ

Нейкія жартаўнікі замкнулі знадворку дзверы гасцінічнага нумара ў Літл Турн (Англія), у якім размясціліся члены ансамбля «Чэрці», што прыбылі на гастролі. Некалькі гадзін замкнёныя грукалі ў дзверы і сцены, крычалі, але ніхто не прыйшоў ім на дапамогу. Натоўп, які сабраўся пад вокнамі, думаў, што ідзе звычайная рэпетыцыя.

«Юманітэ».

«ЧЫСТЫ І СМАЧНЫ»

Каласальны поспех амерыканскага ілюстраванага часопіса для нудыстаў «Плейбой» выклікаў да жыцця аналагічныя выданні ў радзе еўрапейскіх краін. Толькі Федэральная рэспубліка не мела такога часопіса. Ад гэтага часу мюнхенскае выдавецтва «Герэн ферлаг» пачало выпускаць часопіс «Сноб». У рэкламным праспекце гаворыцца, што часопіс будзе даваць «выключна чыстыя і смачны сексуалізм».

«Вохенпост».

МОЛАДЗЬ ЗАБАЎЛЯЕЦЦА

Днямі ў курортным гарадку Лаконі (ЗША) адбыўся фестываль аматараў мотаспорту, на які сабралася каля 20 тысяч матацыклістаў. Пасля заканчэння свята частка прысутных—каля дзвюх тысяч—замест таго, каб ехаць дадому, вырашыла трошкі пазабаўляцца. Лавінаю праносіліся яны па вуліцах бліжэйшых гарадоў, разбівалі каменнямі вітрыны, перакульвалі аўтамабілі, падпалілі некалькі дамоў. Паліцыя і кінутыя ёй на дапамогу злучэнні нацыянальнай гвардыі, узброеныя бомбамі са слезатачывым газам і спецыяльнымі ружжамі, што страляюць зарадамі солі, з цяжкасцю навялі парадак. Каля 70 параненых дастаўлена ў бальніцы, многія з іх у цяжкім стане.

«Фольксштыме».

ГАЎРЫЛІЯДА

Мужчына ці жанчына святы архангел Гаўрыіл? Першымі ўзнялі гэтае пытанне амерыканскія філатэлісты. Пры разглядзе нядаўна выпушчанай маркі, прысвечанай гэтаму святому, яны ўбачылі, што ў Гаўрыіла верхняя частка тулава жаночая. Дырэкцыя пошт патрабавала тлумачэння ў мастакоў, якія рабілі эскіз. Аказалася, што мастакі мелі ў якасці мадэлі старадаўнюю статую Гаўрыіла, устаноўленую на вяршыні вежы метадысцкай царквы ў горадзе Ньюберыпорт, штат Масачузетс. Тэрмінова пасланы туды інспектар пошт агледзеў у падзорную трубу статую і тэлеграфаваў: «Статуя агледжана, у адпаведных месцах сапраўды ёсць пукатасці». Пакуль дырэкцыя пошт і духоўныя ўлады спрачаюцца замяць скандал, калекцыянеры расхапілі ўсе маркі з адлюстраваннем архангела Гаўрыіла. Прычым кошт іх рэзка ўзрос.

«Фольксштыме».

НАВУКОВАЕ АБГРУНТАВАННЕ

Доктар эканамічных навук Джордж Рыдо з Правідэнс (ЗША) зрабіў наступную заяву журналістам: «На працягу 45 гадоў я вывучаю стан амерыканскай эканомікі і ў прыватнасці даходы банкаў. Калі адлюстраваць рост банкаўскіх даходаў за апошнія паўстагоддзя ў выглядзе дыяграмы мы атрымаем крывую, якая павышаецца. З другога боку, калі адлюстраваць графічна павышэнне ўзроўню жаночых сукенак, якія за той жа перыяд станавіліся ўсё карацейшыя, дык акажацца, што абодва графікі ў дакладнасці супадаюць і абодва маюць тэндэнцыю да далейшага павышэння ў бліжэйшым будучым.»

«Юманітэ».

СТАРАМОДНЫ ЗАКОН

Закон 1930 года, які ўводзіў цэнзурныя абмежаванні ў амерыканскай кінапрамысловасці, шмат разоў пераглядаўся і па частках адмяняўся. Нядаўна ён цалкам адменены. Наколькі гэта быў старамодны закон, можна бачыць хоць бы з таго, што ў першапачатковай рэдакцыі закона 1930 года забаранялася нават агаленне верхняй часткі тулава і пацалункі буйным планам.

«Морген».

Усмешкі сяброў

Славамір МРОЖЭК

ПІСЬМО Ў ШВЕЦЫЮ

Паважаны пан Нобель!

Вельмі прашу даць мне Вашу Нобелеўскую прэмію. Просьбу сваю матывую ніжэй сказаным.

Я працую бухгалтарам у адной арцелі і як рахункові работнік хачу выставіць на атрыманне прэміі некалькі кніг, а іменна: Прыходна-расходную кнігу, Касавую кнігу, Складскую і Галоўную кнігі.

Калі Вам захочацца спачатку прачытаць іх, дык я магу прысласць адну або нават усе, але толькі на кароткі час і з умовай вярнуць назад, таму што іншыя таксама хочуць чытаць, асабліва некаторыя рэвізоры. Я Вам, пан Нобель, шчыра скажу, яны так і рвуцца да гэтых кніг, таму лепш будзе, калі спачатку Вы скарыстаеце выпадак і прачытаеце іх.

Я думаю, што Вам гэтыя кніжкі спадабаюцца, таму што я ў іх шмат пішу з галавы. Узяць хоць бы Складскую кніжку. Надарвешся са смеху, сапраўдная сатыра, праўду Вам кажу. Я нават падумваў, каб у польскія пісьменнікі паступіць, бо ў адным часопісе прачытаў, што літаратурная фікцыя мае свае законы і не можа быць адарвана ад жыцця. Ды толькі ж не зразумеюць яны, сувязі ў іх няма з народам. А я Вам усё як на споведзі, бо Вы швед, ну і да таго ж прэмія.

Апрача таго, што многа там з галавы, вельмі ўсё там павучальнае, асабліва для тых маладых, што жыцця не ведаюць. Вельмі цікава. Два гады назад адзін рэвізор проста адарвацца не мог, хацеў нават пасля работы застацца і начытацца ўдосталь. Адарваўся толькі, калі я яму пяцьсот злотых паказаў. Чаго вам яшчэ больш?

Толькі я вельмі Вам раю паспяшацца, таму што мне ўжо хочуць за гэта штосьці даць, адно не ведаю колькі, але думаю, не менш некалькіх гадоў. Вельмі прашу прабачэння, што я так гэта, у апошнюю мінуту, не ведаў, што сёння рэвізія будзе. Чую, яны ўжо ў другім пакоі. Потым, можа, у Вас выпадку не будзе.

Хачу толькі сказаць, што я заўсёды любіў шведаў, а ксяндза Кардэцкага дык я б голымі рукамі задушыў, дарма што здароўе ў мяне слабаватае.

Адказ шліце на гэты адрас. У выпадку чаго, жонка перашле.

Да Вашых паслуг.

Бухгалтар.

Пераклад з польскай.

Веслаў БРУДЗІНСКІ.

АФАРЫЗМЫ

- Не дзіва, што ён баіцца ўласнага ценю, гэты цень бачылі ў такіх падазроных месцах.
- Верх эканоміі —абслужыць усю дыскусію адным аргументам.
- Ад чаго б кароль не тросся— ад злосці ці ад страху, трон хістаецца аднолькава.
- У выніку конкурсу ўзялі на работу хамелеона, каб клапаціўся пра адназроднасці колеру, і дальтоніка — кантраляваць яго.
- Вялікага чалавека можна лёгка пазнаць—ён гаворыць коратка, хоць не абавязаны.
- Пускае чуткі, што ён прадаўся,— яму сорамна, што яго выкарыстоўваюць задарма
- Некаторыя даюць згоду на ланцугі, пераканаўшы, што на канцы іх знойдуць якар выратавання.
- Глухі дырыжор павінен меркаваць аб якасці ігры свайго аркестра па тварах слухачоў.

Пераклад з польскай.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

2 лістапада

Першая праграма. 12.00 — тэлевізійныя навіны (М). 12.15 — для вучняў другой змены. «Гном» (М). 15.55 — праграма перадач. 16.00 — для школьнікаў. «Літаратурны альманах». Перадача з Ленінграда. 17.00 — для дзяцей. «Вясёлыя мінуты». Перадача з Брэста. 17.30 — рашэнні верасневскага Пленума ЦК КПСС — у жыццё. «Павысіць зацікаўленасць кожнага работніка». Гутарка кандыдата эканамічных навук Я. І. Ландзіна. 17.50 — тэлевізійныя навіны. 18.00 — «Свет сёння» (М). 18.30 — «Тэлевізійны матч па спартыўнай гімнастыцы» (М). 20.00—«След у акіяне». Мастацкі фільм. Вытворчасць Свярдлоўскай кінастудыі. 21.20—«На ўзгорках Курасоўшчыны». Рэпартаж аб спаборніцтвах мотакрасменаў Беларусі і Літвы. 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — наш прэс-цэнтр. Выступае Герой Савецкага Саюза лётчык-палярнік М. В. Ваданяў. 22.40 — канцэрт па заяўках старых бальшавікоў.

Другая праграма. 17.00 — да 45-годдзя Марыйскай аўтаномнай рэспублікі. «На галоўнай вуліцы». Дакументальны фільм. Канцэрт (М). 18.00 — «Звераловы». Навукова-папулярны фільм. 19.20 — да 48-й гадавіны Вялікага Кастрычніка. «Сутычка». Кароткаметражны фільм. 19.40 — кіначасопіс. 20.00 —Д. Дэль. «Агітатар». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля. Перадача з Ленінграда. 21.30—Л. Бетховен. Сёмая сімфонія. 22.00 — тэатральныя сустрэчы (М)

3 лістапада

Першая праграма. 12.00 — тэлевізійныя навіны (М). 12.15 — для вучняў другой змены. «Літаратурны альманах» (М). 16.55 — праграма перадач. 17.00 — для школьнікаў. «Школа пачынаючага спартсмена» (М). 17.25 — «У нас ужо свята». Трансляцыя канцэрта з дзіцячага сада № 35. 17.50 — «Песні жыцця». Да 83-й гадавіны з дня нараджэння Якуба Коласа. 18.15 — школьная фільматэка. «Загадка НФІ». Навукова-папулярны фільм. 19.20 — тэлевізійныя навіны. 19.40 — у нас у гасцях «Советская культура». 20.30 — «Гвяздзіні патрэбны закаханым». Дакументальны фільм. 21.30 — музычны антракт. 21.40 — тэлевізійныя навіны (М). 22.10 — «Залацінка». Перадача для моладзі.

Другая праграма. 17.25 — для школьнікаў. «Чым ты захапляешся?» (М). 17.50 — тэлевізійныя навіны (М). 18.00 — «Навука — вытворчасці». Перадача з Вільнюса. 18.30—М. Раухвергер. «Джаміля». Тэлевізійны музычны спектакль (М). 19.40 — «Подзвіг». Тэлевізійны альманах (М). 20.30 — «Жылі-былі стары са старой». Мастацкі фільм. Першая серыя (М). 21.40 — кінанарыс. «Дарагія мае землякі». 22.10 — у эфіры — «Маладосць». «Арбіта» (М).

4 лістапада

Першая праграма. 15.55 — праграма перадач. 16.00 — для дзяцей. «Прыходзь, казка». «Тры аксы майстра Цберы» (М). 17.00—для дзяцей. «Вясёлы цырк». Лялечнае эстраднае прадстаўленне Дзяржаўнага тэатра лялек БССР (трансляцыя на Маскву). 18.00—«Мы — з «Ударніка». Тэленарыс. Расказ пра рабочую сям'ю Катніцкіх. 18.20 — для школьнікаў. «Саперніки». Дакументальны фільм. 18.55—спартыўная перадача. 19.45—тэлевізійныя навіны. 20.00 — «Хлопец з нашага горада». Мастацкі фільм. Вытворчасць Цэнтральнай аб'яднанай кінастудыі мастацкіх фільмаў у Алма-Аце. 21.30 — «Эстафета навін» (М). 23.00 — фальклорныя мініяцюры. Перадача з Бухарэста.

Другая праграма. 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.20 — «Веды» (М). 19.00 — навіны музычнага жыцця (М). 20.20 — «Жылі-былі стары са старой». Мастацкі фільм. Другая серыя (М).

Літаратура і мастацтва 4

Аўторак, 2 лістапада 1965 года.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць ў аўторак і пятніцу

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск вул. Захарава, 19, Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, аддзела сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела мастацтва — 3-24-62 аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, карэспандэнцкага пункта в Гомелі — 2-70-83, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-97-44.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда».

Індэкс 63856. АТ 03514